Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СЬНЕЖАНЬ 24 1932 г. № 286 (4538)

Год выдання XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СХОД МЕНСКАГА ПАРТАКТЫВУ

Учора адбыўся сход актыву Менскай партарганізацыі, на якім тав. ГІКАЛО выступіў з дакладам аб станові́шчы загатоўчай работы ў рэспубліцы.

Актыў цалкам і поўнасьцю ўхваліў пастанову ЦК УсеКП(б) аб ходзе загатовак у БССР і меры, прынятыя ЦК КП(б)Б і СНК для пасьпяховага завяршэньня загатовак усіх асноўных відаў сельска-гаспадарчай прадукцыі ва ўстаноўленыя тэрміны.

Загатаўляць у дзень ня менш 5 проц. гадавога пляну!

Дасягнуты зрух у збожжазагатоўках яшчэ не забясьпечвае выкананьня заданьня у тэрмін

Напружаньнем усіх сіл, ліквідаваўшы сабатаж кулацтва і яго агентуры, даб'ёмся поўнай перамогі ў бліжэйшыя дні

З рашэньня бюро ЦК КП(б)Б, прэзыдыуму ЦКК і СНК БССР

Па дакладу тав. Гікало і тав. Галадзеда — „аб рашэньнях ЦК УсеКП(б) пра ход сельска-гаспадарчых загатовак па Беларусі"

1. Бюро ЦК КП(б)Б, Прэзыдыум ЦКК і СНК БССР ставяць перад усёй КП(б)Б, перад усімі савецкімі, гаспадарчымі арганізацыямі, перад КК баявую задачу—безадклад на пераключыць усе сілы на выкананьне поўнасьцю і ў тэрмін усіх сельска-гаспадарчых загатовак.

Бюро ЦК падкрэсьлівае, што гнілыя ліберальныя адносіны да выкананьня дзяржаўных загатовак як з боку цэнтральных, так і мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый, а таксама да перарадзінскіх элемэнтаў у партыі, сабатуючых загатоўкі—стварылі ганебнае адставаньне ходу выкананьня сельска-гаспадарчых загатовак па БССР, якое і было адзначана ў пастанове ЦК УсеКП(б).

Бюро ЦК, Прэзыдыум ЦКК і СНК пабальшавіцку прызнаюць памылкі, дапушчаныя пры правядзеньні сельска-гаспадарчых загатовак па БССР, указаных ў пастанове ЦК УсеКП(б).

2. Бюро ЦК, Прэзыдыум ЦКК і СНК лічаць, што кожны ГК, РК КП(б)Б, гарсавет, РВК і РКК абавязаны безадкладна прыняць усе меры супроць спекулянтаў, кулакоў, падкулачэнкаў, сабатуючых збожжазагатоўкі, гандлюючых хлебам, для таго, каб на справе забясьпечыць карэнны пералом у ходзе выкананьня загатовак поўнасьцю і ў тэрмін ня толькі ў цэлым па Беларусі, раёнах, але і кожным сельсаветам, калгасам.

3. Бюро ЦК, Прэзыдыум ЦКК і СНК прапануюць—за продаж мяса, хлеба, бульбы і г. д. калгаснікаў і аднаасобнікаў, ня выканаўшых дзяржаўныя абавязацельствы, прыцягваць да адказнасьці, у прыватнасьці, канфіскаваць вывазныя на продаж прадукты, а супроць злосных нездатчыкаў, працягваючых весьці гандаль прымаць меры, як супроць спекулянтаў.

4. Бюро ЦК патрабуе прыняцьця безадкладных і рашучых мер у барацьбе з гніла-перарадзінскімі элемэнтамі ў партыі, хаваючымі сваю антысавецкую работу за славесна-дэкларацыйныя адносінамі да правядзеньня генэральнай лініі партыі.

На падставе дэкрэтнага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, накіраванай на выкрыцьцё агентуры кіўных, перарадзінскіх, буржуазна-нацыяналістычных элемэнтаў, якія прыкрываючы партбілетам і вядуць антысавецкую работу, прыкрываюцца фальшыва-нацыянальнымі сьцягамі, сабатуюць загатоўкі,—партарганізацыі Беларусі, павышаючы класавую пільнасьць усёй арганізацыі, вычышчаючыя ад гэтых чужых перарадзінскіх буржуазных элемэнтаў, на справе даўшы іх уплыву бальшавіцкі адпор, здолеюць забясьпечыць поўнае выкананьне пляну с.-г. загатовак у тэрмін і зьняць з сябе ганебную пляму.

5. Бюро ЦК, Прэзыдыум ЦКК і СНК БССР папярэджваюць усе РК, РВК і РКК аб тым, што за скананьне сельска-гаспадарчых загатовак у раёнах цалкам і ў тэрмін персанально адказваюць сакратары РК і старшыні РВК.

6. Бюро ЦК, Прэзыдыум ЦКК і СНК даручаюць усім членам Бюро ЦК, членам Прэзыдыуму ЦКК і ўпаўнаважаным па загатоўках, а таксама РК КП(б)Б зараз-жа прыняць усе меры непасрэдна на месцы супроць разлажыўшыхся, перарадзінскіх буржуазных, нацыяналістычных элемэнтаў партыі, зрываючых загатоўкі.

7. У адносінах кулацкіх, спекулянцкіх элемэнтаў, падкулачэнкаў, а таксама цьвёрдазаданьнікаў, сабатуючых збожжазагатоўкі, Бюро ЦК, Прэзыдыум ЦКК і СНК прапануюць правесьці мерапрыемствы па лініі судовакарных арганізацый з тым, каб неадкладна злямаць супраціўленьне клясавага ворага. Павінны быць прыняты меры арганізаванага націску па лініі гаспадарчых, а таксама судовых адміністрацыйных мерапрыемстваў на ўсіх ня выконваючых загатоўкі, асабліва аднаасобнікаў.

8. Бюро ЦК, Прэзыдыум ЦКК і СНК пастанаўляюць: не пазьней раніцы 20-XII г. г. у дапаўненьне да таварышоў, якія знаходзяцца на вёсцы, выехаць на месца ўсім членам і кандыдатам Бюро ЦК, членам Прэзыдыуму ЦКК для правядзеньня ў жыцьцё данай пастановы, за выключэньнем т. Гікало па ЦК КП(б)Б, т. Лычова па СНК і ЦКК і т. Закоўскага па ПП АДПУ.

9. Адзначаючы зусім нездавальняючае становішча справаздачнасьці па загатоўках, Бюро ЦК, Прэзыдыум ЦКК і СНК прапануюць, пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў адпаведных загатоўчых арганізацый і пад кантроль сакратароў РК і старшынь РВК, наладзіць справу справаздачнасьці такім чынам, каб кожны дзень свячасова даваліся праверэныя дакладныя весткі, адбіваючыя сапраўдны ход загатовак. Папярэдзіць усе загатоўчыя арганізацыі, што за невыкананьне гэтай пастановы аб справаздачнасьці вінаватыя будуць аддаены пад суд.

10. Даручыць персанальна т. Лычову і Закоўскаму ў адказленны тэрмін прыцягнуць да адказнасьці:

а) усіх кіраўнікоў загатоўчых арганізацый (па збожжы, ільне, мясе, бульбе і інш.), ня выканаўшых пастановы ЦК аб накіраваньні сваіх адказных работнікаў на месца загатовак;

б) судовых работнікаў, якія не разабралі ў кароткі тэрмін перададзеных ім спраў аб раскрадваньні збожжа, памольнага збору і г. д. і сваімі мяккімі прыгаворамі спрыялі гэтаму раскрадваньню;

в) работнікаў сыстэмы Наркамзему і Упаўнаркамзагатасаў, даўшых у сваёй дырэктыве саўгасам перапаменшаньня паказаньні па ўраджайнасьці;

г) работнікаў, ня выехаўшых на загатоўкі.

11. Даручыць рэдакцыям усіх цэнтральных і раённых газэт перабудаваць работу сваіх газэт такім чынам, каб прыблізна ½ газэты было запоўнена матар'ялам па загатоўках пад пунктам погляду выкананьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб загатоўках.

12. У сувязі з асаблівым адставаньнем у ходзе загатовак прапанаваць усім партыйным, савецкім і прафэсіянальным арганізацыям як цэнтральным, так і раённым, ня зьбіраць ніякіх нарад і пленумаў, зьвязаных з выклікам работнікаў з месц, да скананьня пляну загатовак.

13. Прапанаваць членам Бюро ЦК, выехаўшым у раён, не вяртацца да скананьня пляну загатовак.

14. Прапанаваць усім аддзелам ЦК КП(б)Б камандыраваць на загатоўкі ўвесь свой апарат, пакінуўшы ў аддзелах ня больш аднаго—двух работнікаў.

„Актывісты" па... зрыву загатовак

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Прыехаўшы ў Барысаў для дапамогі мясцовым арганізацыям у правядзеньні загатовак, намесьнік старшыні СНК БССР тав. Грысевіч наведаў 19 сьнежня В.-Нечаўскі сельсавет. З удзелам тав. Грысевіча абгаворвалося пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму сельсавету.

У мінулым годзе В.-Нечаўскі сельсавет выканаў заданьне ў 62 тоны збожжа поўнасьцю. У гэтым годзе план складае толькі 27 тон і ўсё-ж гэта зьмяшчанае заданьне за вочы дзень выканана толькі на 66 проц.

Сельсавет аслабіўся засмечаным кулацкімі і спекулянцкімі элемэнтамі, якія сьвядома сабатуюць здачу збожжа дзяржаве.

Член сельсавету Акуневіч Хведар ня толькі сам ня выконвае заданьня і спекулюе сельска-гаспадарчымі прадуктамі, але яшчэ агітуе сялян супроць збожжазагатовак.

Член сельсавету Дзімянцей літаральна нічога ня робіць для выкананьня пляну па яго вучастку. Ён сам таксама ня выканаў заданьня па здачы збожжа. «Няхай брыгадзіры выконваюць пляны, а я сварыцца з сялянамі сваёй вёскі ня буду», — кажа Дзімянцей. Найгрэй-ці трэба даводзіць кулацкі твар гэтага, з дазволу сказаць, «актывіста».

Член сельсавету Сакалоўскі апусьціў дзяржаву. З вызначанага заданьня ў 100 кгр. збожжа, ён здаў толькі 24 кгр., а на рэшту прадставіў квіткі мінулага году. Жульніцкі маноўр Сакалоўскага быў выкрыт.

Яшчэ адзін член сельсавету Касьцюковіч (кандыдат партыі) проста не жадае займацца загатоўкамі і тлумачыць гэта тым, што «вельмі перагружан іншай работай».

Націску на кулацка-заможныя гаспадаркі ў сельсавеце няма. Замест гэтага сельсавет займаецца проста апушчаньнем. На запытаньне райпракурора, ці спагнаны цьвёрдыя заданьні, сакратар сельсавету Аляксееў адказаў: «Так, поўнасьцю спагнаны».

А потым выявілася, што з гаспадарак кулакоў і заможнікаў Стасевіча, Радзюка, Гасўскага да гэтага часу цьвёрдыя заданьні не спагнаны ні па адным відзе загатовак. Кулак Марцынкевіч Міхась упарта ня выконвае цьвёрдых заданьняў, а сельсавет ніякіх мер ня прымае. Нават пасьля суда над кулакамі, сельсавет не патурбаваўся спагнаць з іх штраф і забраць прадукцыю.

Кіруючая роля партячэйкі не адчуваецца. Пасобныя партыйцы — Касьцюковіч, Цялюк і інш. ігнаруюць дырэктывы партыі. Бюро ячэйкі адносіцца прымірэнча да апартуністаў—дапаможнікаў кулацтва.

Прэзыдыум сельсавету вывеў са складу сельсавету Акулевіча і Сакалоўскага і пастанавіў аддаць іх пад суд за зрыў загатовак, за дапамогу кулацкаму сабатажу.

У сельсавет выехаў нарсуд для разгляду ў паказальным парадку спраў былых членаў сельсавету, а таксама кулацка-заможных гаспадарак, ня выконваючых цьвёрдых заданьняў.

Я. Ів.

Чорная дошка
Зрыўшчыкам загатовак

За злоснае і сыстэматычнае невыкананьне пляну дзяржаўных загатовак сельгаспрадуктаў пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б занесены на чорную дошку наступныя раёны і сельсаветы:

РАЁНЫ:

1) Талачынскі, 2) Горацкі, 3) Кармянскі, 4) Дубровенскі, 5) Асьвейскі.

СЕЛЬСАВЕТЫ:

ПА ЧАЧЭРСКІМ РАЁНЕ: Будзішчанскі і Глыбачанскі.
ПА БУДА-КАШАЛЕЎСКІМ: Надальскі, Паталаўскі і Губкінскі.
ПА МЕНСКІМ РАЁНЕ: Караліщанскі, Алачацкі, Папярнянскі.
ПА БІЦЕБСКІМ РАЁНЕ: Старасельскі і Рудакоўскі.
ПА СЕНЕНСКІМ: Машчонскі і Алексінскі.
ПА ДЗЯРЖЫНСКІМ РАЁНЕ: в. Станкава, Каменка і Шатанаўшчына.

У гэтых раёнах неадкладна спыняецца падвоз тавараў і аналогічныя дзяржаўны гандаль на месцы.

Вывозяцца з аналогічных крам і складаў усе наяўныя прамтавары. Поўнасьцю забараняецца налгасны гандаль. Спыняецца ўсякага роду крэдытаваньня і датэрмінова спаганяюцца ўсе выданыя крэдыты і інш. фінансавыя абавязацельствы.

ТЭМПЫ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ПА БССР
(У проц. да гадавога пляну разам з насеньпазыкай)

На 20 сьнежня	На 21 сьнежня	На 22 сьнежня
67,6	68,7	70, 0

Угаворы і ўпрошваньні замест націску на кулака

РЭЧЫЦА. (Наш кар.). Прайшло восем дзён штурму. За гэты час Маладуцкі і Н. Барсукі сельсаветы наблізіліся да поўнага завяршэньня збожжазагатовак, вычачаўшы план на 95-99 проц. Старшыня Маладуцкага сельсавету тав. Райкевіч зусім правільна тлумачыць посьпех загатовак шырокім разгортваньнем масавай работы, мабілізацыяй актыву і бязь літасным ударам па кулацкаму сабатажу.

Іншыя вёскі ў Хольмінім сельсавеце. Прайшло восем дзён, а аднаасобны сэктар выканаў план толькі на 32 проц.

У сельсавеце ня вестаюць, на колькі процантаў выкананы цьвёрдыя заданьні. Старшыня сельсавету тав. Чарняўскі вельмі спакойна заўважае: «Ніхто з іх поўнасьцю ня здаў, здаюць па-трошку».

Наогул, кулакоў у Хольмінім сельсавеце ніхто ня турбуе. Родзянок Сьцяпан сам не здае збожжа і адкрыта агітуе сярод сялян за сабатаж загатовак. Сельсавет вельмі спакойна глядзіць на гэта і чакае, калі Рудзянок пазвае збожжа. Ня выкошваюць цьвёрдых заданьняў таксама заможнікі Юрка Шінчук, Андрэй Кашэль, Пётра Кашкар і інш.

Цікавы малюнак работы па гэтым сельсавеце паказаў апошні пленум, на якім былі падведзены вынікі загатовак.

Вось выступае член сельсавету з вёскі Дварэц—Марачкоўскі. Ён спакойна падгульвае: «Мая вёска здала 1.057 кгр., трэба—2.100». Сам Марачкоўскі ня здаў нічога.

Гаварыць Ігнат Качала з вёскі Калочын:

— Дрэнна здаюць у нас—прызнаецца Ігнат.

Яго пытаюць: «А ты здаў?»

— 25 кгр. здаў.

— А колькі трэба было?

— Ды чорт яго ведае. Ня ведаю. Цьвёрдазаданьнікаў ёсьць два, але ў іх нічога не знайшлі.

Дакладвае Мацьвей Кулік. Ён працуе ў самым мястэчку Хольмічы, адказвае за выкананьне пляну па адной толькі вуліцы.

— Хадзіў, хадзіў і за два дні сабраў толькі 2 цэнт. Трэба сказаць, што мая вуліца самая беднай, няма каму выкананьне.

Яго пытаюць: «Кажы, калі ласка, а кулак Чэрнок таксама ў бедняку трапіў, а Калтасейка, а Вайтовіч Нікапор?».

Кулік адказвае: «Жывуць яны ня дрэнна, але вось збожжа ў іх ня відаць».

Ні адзін цьвёрдазаданьнік ня здаў поўнасьцю збожжа, бо сельсавет чатыры месяцы ўгаворваў іх пазесьці жыта і пшаніцы нічога не знайшоў, бо кулак схаваў збожжа, або вынес яго на Рэчыцкі рынак.

Якіх посьпехаў можна дасягнуць з такім «актывам»? Гэта не актыў, а кулацкія «пячальнікі», якіх нельга ні аднаго дня трымаць у сельсавеце. Характэрны ў гэтых ад восьмых адказ члена сельсавету Фэдоса Рудзянка: ён, бачыце, нічога ня здаў, бо «Лухім Бяркоўскі багацей за мяне, але ён здаваць ня хоча, чаму-ж я буду здаваць».

У Хольмічах ёсьць сапраўдны актыў. Вось ён. Бецюк Шурупа Парфон замест 40 кгр. здаў 60, Кныч Андрэй замест 59—64 кг. Дзяўчаты з калгасу «Чырвоное Дняпро» Параська Дзежка, Хрысьця Драгун пакаралі ўворы баявой работы па загатоўках.

Д

Пад апекай кулацкіх „пячальнікаў"

КРЫЧАЎ. (Наш кар.). Крычаўскі раён, як і раней, адстае ў выкананьні пляну збожжазагатовак. Аднаасобны сэктар выканаў свае абавязацельствы на 33,3 проц. Цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак спагнаны толькі на 50 проц. За ўвесь час загатовак паступіла толькі 5 пэнтн. насеньпазыкі замест 129 тон.

Асноўная прычына адставаньня раёну гэта надзвычай слабы націск на кулацтва ў радзе сельсаветаў.

Возьмем Касьцюшкаўскі сельсавет, які ўвесь час пляцецца ў хвосьце і ня злазіць з чорнай дошкі. Плян збожжазагатовак па гэтым сельсавеце выканан толькі напалову, прычым аднаасобнікі здалі кала 15 проц. Лічбы красамоўна гавораць аб сапраўды ганебнай рабоце на загатоўках.

Старшыня сельсавету, член партыі Шыткоў, сакратар сельсавету заможнік Касьценіч і член сельсавету Шураёў узяті пад сваю апеку кулацка-заможныя гаспадаркі. Яны далі магчымасьць кулаком разбазарыць і схаваць збожжа, заўважыўшы, што «ў нашых кулакоў збожжа няма». Пры актыўнай дапамозе кіраўнікоў сельсавету заможнікі Яжорскія Андрэй і Іван разбазарылі сваё збожжа, ня здаўшы ні аднаго кілограма. Распрадаў сваё збожжа і заможнік Касьценіч — дзядзька сакратара сельсавету.

Бацька сакратара — заможнік Касьценіч, пралезшы ў калгас «Новае Сормава», падбухторвае адсталую частку калгаснікаў ня вывозіць пляну, у выніку чаго калгас да гэтага часу ня здаў поўнасьцю збожжа.

Кулацкі агент — кандыдат партыі, старшыня калгасу імя Карла Маркса, Касьцюшкаўскага сельсавету — Чыж упарта ня выконвае пляну здачы збожжа. На сходах калгаснікаў ён распальвае рвацкія настроі: «Збожжа здаваць ня трэба». Вось твар агентаў клясавага ворага ў Касьцюшкаўскім сельсавеце.

Касьцюшкаўская партыйная ячэйка, на чале з сакратаром Веранінавым, сваёй бязьдзейнасьцю, палітычнай сьлепатой умацоўвала пазыцыі кулацкіх элемэнтаў.

Адстае і рашаючы Палажэнцкі сельсавет. Тут кулак таксама не атрымлівае належнага адпору, тут заможнікі сабатуюць выкананьне цьвёрдых заданьняў. У гэтым сельсавеце выяўлен факт захаваньня ў калгаснікаў 100 пудоў збожжа, якое належыць цьвёрдазаданьнікам. Калгас «Ленінскі прызыў» гэтага сельсавету ня выканаў свайго абавязацельства перад дзяржавай. Член партыі Сівадзедаў — былы старшыня гэтага калгасу — узначальваў кулацка-рвацкія тэндэнцыі. Замест таго, каб выкрыць кулацкага агента Сівадзедава, райком вылучыў яго затаўчыкам млыну.

У Крычаўскім раёне не арганізавана барацьба са спекулянтамі і перакупшчыкамі.

Трэба проста сказаць, што Крычаўскі раённы камітэт партыі і РВК ня выкрылі кулацкіх агентаў з Касьцюшкаўскага і іншых сельсаветаў, ня выкрылі маноўраў клясавага ворага. Стаўленьнікі кулацтва прадыгваюць сваю шкодніцкую дзейнасьць. Сакратар Касьцюшкаўскай партыйнай ячэйкі — Веранінаў зараз вылучан загатаўчыкам АПА габінэту РК КП(б)Б.

Трэба даваць, што па раёне не праводзіцца выхаваўчая работа з беспартыйным актывам, з перадавымі калгаснікамі, беднякамі і серадняцкамі. Усё гэта выклікала адставаньне Крычаўскага раёну.

В. Фесько.

Перараджэнцы выключаны з партыі

ВОРША. (Па тэлефону ад нашага спецкора). Пастановай Аршанскай РКК выключан з партыі сакратар парт'ячэйкі Талькаўскага сельсавету Буракоў за яўны сабатаж збожжазагатовак, бязьдзейнасьць, за нежданьне мабілізаваць масы на выкананьне пляну.

Выключан таксама з партыі загатчык Аршанскага аддзяленьня Дзяржкупаўцтва БССР Вірскі за парушэньне пастановы РК і РВК. Ён самавольна, без дазволу Райкому выехаў з Машкоўскага сельсавету, дзе праводзіў збожжазагатоўкі.

Б. ПАПОЎ.

Цішаўскі сельсавет дапамагае Гаранскаму

МАГІЛЕЎ. (НАШ КАР.).

ЦІШАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ ПЕРШЫМ У РАЁНЕ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК, ПЕРАМОГА ДА СЯГНУТА У ВЫНІКУ ШЫРОЧАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОТЫ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ І ПРАЦОЎНЫХ АДНААСОБНІКАЎ, БЯЗЬЛІТАСНАЙ БАРАЦЬБЫ З КУЛАЦТВАМ І ЯГО АГЕНТУРАЙ. У СВАІМ РАПАРЦЕ РАЙКОМУ КП(б)Б СЕЛЬСАВЕТ АБЯЦАЕ І НАДАЛЕЙ ПА-БАЯВОМУ ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ УСІХ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНЫХ КАМПАНІЙ.

СЕЛЬСАВЕТ НАКІРАВАЎ БУКСІРНУЮ БРЫГАДУ Ў АДСТАЮЧЫ ГАРАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ. БРЫГАДА ЗА КАРОТКІ ТЭРМІН ДАБІЛАСЯ РЭЗКАГА ПЕРАЛОМУ Ў ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК ПА ГАРАНСКІМУ СЕЛЬСАВЕТУ, ПРЫ ДАПАМОЗЕ БРЫГАДЫ АДНААСОБНІКІ ГАРАНШЧЫНЫ, 18 СЬНЕЖНЯ АРГАНІЗАВАЛІ ЧЫРВОНЫ АБОЗ І ЗДАЛІ ДЗЯРЖАВЕ 350 ПУД. ЗБОЖЖА.

ЗА 3 ДНІ РАБОТЫ БРЫГАДЫ ПА СЕЛЬСАВЕТУ ЗАГАТОЎЛЕНА 1.000 ПУД. ЗБОЖЖА. ГАРАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ УЖО НАБЛІЖАЕЦЦА ДА 100 ПРОЦ. ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ.

Ленінскі камсамол павінен быць у першай калёне барацьбітоў за збожжа

Работа беларускай камсамольскай арганізацыі на фронце загатовак яўна нездавальняючая.

Пасобныя РК не забясьпечылі штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва работай ячэек на мясцох. Адсутнічала шырока разгорнутая масава-растлумачальная работа сярод членаў камсамолу аб палітычнай важнасьці поўнага выкананьня ўсіх відаў загатовак, як першачарговай задачы камсамольскай арганізацыі.

Разглядзеўшы пытаньне аб удзеле камсамольскай арганізацыі ў загатоўках, бюро ЦК ЛКСМБ канстатавала рад недахопаў у гэтай галіне і прыняло меры да таго, каб стварыць карэнны пералом.

Даручана ўсім ГК і РК ЛКСМ забясьпечыць штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва ўсімі ячэйкамі раёну шляхам неадкладнай перакідкі ўсяго раённага камсамольскага актыву ў дапамогу загатоўкам.

Кожны камсамолец павінен атрымаць сутачнае заданьне. Ячэйкі павінны штодзённа заслухоўваць справаздачы аб праробленай рабоце за дзень.

ЦК папярэдзіла ўсіх сваіх упаўнаважаных, ГК і РК, усе камсамольскія ячэйкі і камсамольцаў, што да невыканаўшых гэтыя заданьні, будуць прыняты меры, як да нездольных ажыцьцявіць дырэктывы партыі і ўраду, як да не апраўдаўшых высокай назвы члена ленінскага камсамолу.

За злачынную бязьдзейнасьць у выкананьні дырэктыў партыі і ўраду па загатоўках, за апартуністычнае самазаспакаеньне ў гэтай рабоце і няўменьне мабілізаваць камсамольскую арганізацыю на бальшавіцкую барацьбу за збожжа ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ І ВЫКЛЮЧАНЫ З РАДОЎ ЛКСМБ САКРАТАРЫ РК АСЬВЕЙСКАГА РАЁНУ—НАЛІВАЙКА, РЭЧЫЦКАГА — НОВІК, НАРАЎЛЯНСКАГА — УЛЬЯНАЎ.

Даручана т. Комараву ў 24-гадзінны тэрмін пастаўіць пытаньне перад ЦКК КП(б)Б аб дальшым прабываньні іх у радах партыі.

За ад'езд у адпачынак без дазволу ЦК у часе загатовак зьнят з работы і выключан з радоў камсамолу САКРАТАР ЧЭРВЕНЬСКАГА РК ЛКСМ т. СЬНЯЖКО.

Аргаддзелу даручана ў тэрміновым парадку абсьледаваць Бабруйскі РК КСМ, у сувязі з дапушчаньнем ім скрайнятычных адносін да кіраўніцтва калгаснымі ячэйкамі.

Для дапамогі раённым арганізацыям камандыравана 225 чал. з цэнтральнага актыву і ўсе члены бюро ЦК ЛКСМ.

Рэзалюцыі не ператвораны ў жывую справу
(АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

ЧЭРВЕНЬ. Практыка збожжазагатовак паказвае, што там, дзе работа пастаўлена па-баявому, дзе не шкадуюць ні сіл, ні сродкаў, каб нагнаць „упушчанае, там тэмпы загатовак шпурхільна павышаюцца, там пляны перавыконваюцца. Там-жа, дзе працуюць па-аблома'ўску, дзе панае размагнэсаванасьць—там пляны зрываюцца. Аб гэтым досыць ярка гаворыць і вопыт Чэрвеньскага раёну, які адстае на ўсіх відах загатовак, у тым ліку па збожжы. Нельга сказаць, што раённыя арганізацыі шкадуюць прыгожых слоў і ўрачыстых дэкларацый. Словы «выканаць поўнасьцю» і «ў тэрмін» можна сустрэць на многіх рэзалюцыях, але тэмпы загатовак ад гэтага нікольскі не павысіліся, бо рэзалюцыі не ператвораны ў жывую справу.

Яшчэ ў першых лічбах сьнежня райком партыі ў сваёй рэзалюцыі напісаў: «Канчатковым тэрмінам выканаўня пляну збожжазагатовак лічыць 15 сьнежня». Парт'ячэйкі ўзялі на сябе абавязацельствы «прыняць неабходныя меры для ажыцьцяўленьня дырэктывы райкому». Запісаць — запісалі, а неабходных мер так і не прынялі. У рэзультаце — тэмпы загатовак засталіся на ранейшым узроўні: 8—9 тон збожжа ў суткі замест 40.

Прашоў дзень 15 сьнежня. Улік паказаў лічбу — «76,7 проц.». Плян, як бачыце, ня выканан. Райком, РВК пачалі шукаць вінаватых. 16 сьнежня райком вынес новую пастанову, у якой адзначыў «невыкананьне ўзятых на сябе абавязацельстваў з боку парт'ячэек». Такім чынам, уся вина за зрыў загатовак усклядзена выключна на парт'ячэйкі. Ні слова самакрытыкі ў пастанове няма. Зразумела, многія парт'ячэйкі сваімі ліберальнымі адносінамі да маноўраў клясава-варожых элемэнтаў тармазілі выкананьне пляну, але нельга ўтойваць і віну раённых арганізацый. Устанавіўшы канчатковы тэрмін — 15 сьнежня, РК і РВК не прынялі рашучых мер, якія забясьпечылі завяршэньне загатовак. Яны абмежкаваліся «прымацаваньнем» так званых упаўнаважаных па некаторых сельсаветах і не забясьпечылі штодзённага кантролю за іх работай. Упаўнаважаныя раз у пяцідзеньку, як гастралёры, выяжджалі на месцы, «накручвалі» сельсаветы, забіралі весткі і ўяжджалі назад, а сельсаветы бязьдзейнічалі, чакаючы пакуль селянін сам прывазе збожжа на пункты. Што дадатнага ў тым, што вызначаны тэрмін застаўся голай дэкларацыяй!

Другім канчатковым тэрмінам вызначана 20 сьнежня, але і на 21 сьнежня процант выканаўня ледзь дасягнуў 80. Прырост за пяцідзеньку — 3.3 проц. З 13 сельсаветаў толькі адзін Грыбынаўскі дабіўся 100 проц. выканаўня пляну.

У чым справа? Чаму пляны збожжазагатовак, амаль у два разы меншы леташняга, дагэтуль ня выканан? Асноўная прычына — зусім слабы адпор кулацкаму сабатажу, прытупленьне клясавай пільнасьці з боку раду членаў партыі.

Характэрным фактам у гэтых адносінах выступаецца невыкананьне пляну загатовак па цьвёрдых заданьнях. З кулацка-заможных гаспадарак спагнана толькі 78 проц. Ва многіх сельсаветах гэты процант яшчэ меншы, — па Калодзішчанскім — 47,7 проц., па Вайловіцкім — 57 проц., Гараўскім — 63 проц.

Сам намесьнік старшыні РВК тав. Бярозкін заяўляе, што ў раёне ня было націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, што а апошнімі ў большасьці «ліберальнічалі». Усяго па раёне лічыцца 153 цьвёрдазаданьнікаў; на сёньняшні дзень поўнасьцю спагнана збожжа толькі з 40 гаспадарак. Досыць пекалькі характэрных прыкладаў маноўраў кулака і яго агентуры. Цьвёрдазаданьнік з вёскі Юраўшы Рыгор Пяхота зноў час не здаваў збожжа, матывуючы гэта тым, што ў яго «нічога няма». Калі-ж на яго прышлі працаўнікі сельсавету, дык пры праверцы знайшлі ў яме бочку з ячменем, а пад ложкам шмат жыта. У Рудзішкім сельсавеце ў двух заможнікаў было спойдзена вакапаным ў яму 80 пудоў збожжа. Досыць рад выпадкаў, калі асобныя кулакі перахоўваць да адкрытага супраціўленьня працаўнікам сельсавету. У вёсцы «Рванікая Слабада» заможнік Кабцых хацеў забіць члена сельсавету Шашуту.

Усе гэтыя факты сьведчаць, што клясавая барацьба ваюл збожжазагатовак прыняла самыя вострыя формы. Гэтага не бачаць кіраўнікі Чэрвеньскага раёну. Яны спакойна адносяцца да кулацкага супраціўленьня, нават камуністы, якія дапамагаюць кулацкаму сабатажу заставацца непакаранымі. Яшчэ ня было ні аднаго выпадку выключэньня з радоў партыі за патураньне кулаку. А такіх камуністаў, якія сталі агентамі кулака, у раёне ня мала. Возьмем напрыклад парт'ячэйку сайтасу «Рушня Старавіта». Сакратар ячэйкі, ён-жа дырэктар сайтасу тав. Рыўтовіч ня толькі не дапамагае сельсавету ў загатоўках, а, наадварот, тармозіць гэту работу, не адпускае на загатоўкі ні аднаго члена ячэйкі. Замест прыняцьця рашучых мер супроць кулакоў, Рыўтовіч узяў на сябе ролю кулацкага адваката, хадайнічаў за зьняцьці цьвёрдых заданьняў з двух заможнікаў. У той час, калі забаронен памол збожжа сялянам, якія ня выканалі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай, Рыўтовіч дазволіў усім карыстацца сайтасным млынам.

А вось і другі факт. Старшыня калгасу «Чырвоны шлях» тав. Паўлоўч проста заявіў: «Пятай калёне лепш з партыі выключаць, а збожжа я ня здам». Досыць і такіх камуністы, якія лічаць, што «выкананьне пляну загатовак — гэта справа толькі савецкіх арганізацый, парт'ячэйка не павінна гэтым займацца». З подобнага роду «тэорыяй» выступіў член бюро Разьянкай ячэйкі тав. Баравік.

Цікава, што гэтыя «камуністы» ня толькі ня выключаны з партыі, але нават ня зьняты з адказнай работы.

Райком камсамолу на працягу трох месяцаў зусім не займаўся загатоўкамі. Камсамольскія ячэйкі таксама сталі ў баку. Справа дайшла да таго, што былы сакратар райкому камсамолу тав. Сьнажко зусім дэзэртаваў з раёну.

Такавы прычыны марудзнага невыкананьня пляну збожжазагатовак па Чэрвеньшчыне.

Райком партыі і РВК павінны неадкладна выправіць папушчаньні памылкі, узмацніць націск на кулака і суровa пакараць тых, хто дапамагае кулацкаму сабатажу. Толькі пры гэтай умове Чэрвеньшчына выйдзе ў рады перадавікоў.

Фралоў.

Да 1-га студзеня выканаць 80 проц. пляну ільназагатовак

ЗАГАТОЎКІ ІЛЬНАТРАСТЫ—ПАЛІТЫЧНЫ ЭКЗАМЕН ДЛЯ ІЛЬНАЗАВОДАЎ

КОЖНЫ ДЫРЭКТАР, КОЖНЫ ЗАВОДСКІ КАЛЕКТЫЎ АДКАЗВАЕ ПЕРАД ПАРТЫЯЙ ЗА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ ТУРБІН ДОБРАЯКАСНЫМ СЫРЦОМ

ЧАМУ НЕ НАГРУЖАНЫ ТУРБІНЫ...

«Машына ўсё пераробіць, ільназаводы могуць прыняць усякі сырц»—вось тэорыя, якую распаўсюджвае кулацтва і яго агентура ў ільназводчых раёнах БССР.

Факты і лічбы паказваюць, што гэта тэорыя, не сустракаючы адпаведнага адпору з боку мясцовых арганізацый, дзе-ні-дзе мае посьпех.

Паводле пляну 60 ільназаводаў БССР павінны загатовіць **54.990 тон** ільнавой трасты. Прычым, высокаякаснай трасты, або турбінай, якая дае чыстае валакно, трэба загатовіць 65 проц., кудзельнай трасты—35 проц.

Плян загатовак ільназаводы павінны закончыць да 1 студзеня 1933 году.

Часу засталося зусім мала. Ня гледзячы на гэта ўсімі ільназаводамі загатоўлена толькі 1.989 тон, што складае 36,2 проц.

Па асартымэнту, загатоўленая траста складае 33,8 проц. турбінай і 62,2 проц. кудзельнай. **Асьвейскі** ільназавод загатовіў усяго 6 проц. турбінай трасты, **Коханаўскі**—4,3 проц., **Бігосаўскі**—2,9 проц., а на **Пухавіцкім** заводзе зусім няма турбінай трасты. Нават буйнейшы ў БССР **Шклоўскі** ільназавод загатовіў 7 проц. турбінай. Толькі **Лёзьнянскі і Расонскі** ільназаводы вытрымліваюць кандыцыі па якасьці загатоўленага сырцу.

Гэта значыць, што большая частка загатоўленай трасты нізкай якасьці, **гэта значыць, што асноўная машына па пераапрацоўцы ільну—турбіна—прымушана бязьдзейнічаць.**

Галоўнай прычынай такога становішча зьяўляецца тое, што як ільназаводы, так і МТС ільнаводчых раёнаў, яшчэ ня сталі арганізатарамі ільназагатовак.

Сартаваньне трасты—складаная справа. Ня ўсюды ведаюць, як гэта трэба рабіць, якіх стандартаў патрабуюць ільназаводы.

Адсталая частка калгасьнікаў, падпаўшы пад уплыў кулацтва і яго агентуры, вязе на завод зусім нягодны сырц, там яго ня прымаюць і калгасьнік прымушан везьці назад. Такія факты, як мы ўжо адзначалі, мелі месца на **Дуброўенскім, Вушацкім, Дрысенскім** і некаторых іншых ільназаводах.

Зусім ясна, што за гэта ў першую чаргу нясуць адказнасьць самі ільназаводы і МТС, якія не далі адпору кулацкай агітацыі, ня эдолелі арганізаваць сартаваньня ў калгасах, не мабілізавалі калгасныя масы на сваячасовае і добрасумленае выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

У шасобных мясцох мы нават назіраем патураньне кулаку. Напрыклад, **дырэктар Гарадзецкай МТС** патрабаваў, каб ільназавод прыняў ад калгасаў нягодную вільготную трасту. На **Бушацкім** ільназаводзе **інспэктар па якасьці Кац**, таксама прыймаў пасаваную трасту, зрабіўшы 30 проц. скідку з яе кошту. Такі гнілы лібералізм толькі на руку кулаку, на руку клясаваму ворагу, які ўжывае ўсе меры, каб сарваць ільназагатоўкі, каб разбазарыць, расьцягнуць гаварную прадукцыю.

Слабым месцам у рабоце ільназаводаў зьяўляецца непадрыхтаванасьць да прыёмкі. На прыёмцы працуе невыстарчальная колькасьць людзей, часта непопытных. У выніку, ля заводаў чаргі ільназдатчыкаў (Дуброўна, Вушачы).

Некаторыя ільназаводы, як Шклоўскі, у мэтах самастрахоўкі, сьвядома зьніжаюць якасьць трасты і не даплачваюць калгасам за іх прадукцыю. Зразумела, гэта зьніжае запікачэнасьць калгасьнікаў у здачы трасты лепшай якасьці і зноў такі грае на руку клясаваму ворагу.

Якія вывады трэба зрабіць з цяперашняга становішча з загатоўкай ільнатрасты.

Першы і асноўны вывад—кожны дырэктар, які хоча, каб яго завод быў забясьпечан сырцом, павінен у першую чаргу аб гэтым паклапаціцца сам.

Да кожнага калгасу і сельсавету трэба давесьці каляндарны плян прыёмкі сырцу. Дапамагчы калгасам правільна сартаваць трасту—першачарговая задача ільназаводаў. Сартаваньне трэба арганізаваць у самім калгасе. Кожны калгасьнік павінен ведаць якасныя запатрабаваньні заводу да сырцу. Кожны калгас, кожны сельсавет павінен мець у сябе ўзоры годнага і нягоднага сырцу.

Арганізуючы прыёмку і ацэнку сырцу трэба безадкладна выправіць памылкі, дапушчаныя ў шасобных мясцох. Стандарты трасты павінны мець кожны прыёмшчык з тым, каб ільназдатчык мог параўнаць стандарт са здаванай ім прадукцыяй.

Стаць арганізатарамі ільназагатовак, ма білізаваць актыўнасьць перадавых калгасьнікаў, выкрыць кулацкія манэўры і зламаць кулацкі **сабатаж—вось баявая задача ільназаводаў.**

ЗВОДКА

аб ходзе ільназагатовак па ільнаводчых раёнах БССР на 20 сьнежня 1932 г.

№ па ч.	Назва раёнаў	Плян у тонах.	Проц. выкананьня.
1.	Бяльніцкі	400	63,4
2.	Лёзьнянскі	2.200	51,9
3.	Дрысенскі	1.415	51,8
4.	Крупскі	550	48,9
5.	Чашніцкі	465	47,8
6.	Сураскі	1.130	46,3
7.	Лепельскі	825	38,2
8.	Горацкі	1.160	38,0
9.	Полацкі	700	35,8
10.	Вушацкі	510	35,7
11.	Мсьціслаўскі	1.400	33,5
12.	Талочынскі	950	32,5
13.	Чашускі	750	31,9
14.	Оршанскі	1.100	30,7
15.	Бешанковіцкі	720	29,2
16.	Шклоўскі	1.540	28,6
17.	Сенонскі	1.125	26,3
18.	Гарадоцкі	1.570	24,8
19.	Расонскі	700	21,9
20.	Дуброўенскі	1.000	16,1
21.	Асьвейскі	230	15,2
Разам па ільнаводч. раёнах		20.450	36,0
Усяго па БССР		27.000	37,6
У тым ліку:			
Саўгасы		450	72,1
Калгасы — МТС		7.270	37,1
Калгасы не МТС		9.730	45,4
Адпаасобнікі		9.550	27,5
У тым ліку па цьвёрдых заданьнях		948,5	17,2

«Загатлён».

Кулацкі сабатаж у Шклоўшчыне

Шклоў — буйнейшы ільнаводчы цэнтр БССР. На тэрыторыі раёну некалькі ільнаапрацоўчых заводаў і МТС. і ўсё-ж у ільнаводчай групе раён займае 16-е месца па выкананьні пляну ільназагатовак. На 15 сьнежня гадавы плян выкананы на 24 проц. Ні адзін сельсавет яшчэ ня выканаў сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Калі мы больш уважліва прааналізуем факты з практыкі работы мясцовых арганізацый, дык адразу заўважым, што ў радзе сельсаветаў мы маем справу з яўным кулацкім сабатажам ільназагатовак і поўнай бязьдзейнасьцю мясцовых арганізацый.

Для прыкладу возьмем **Ардацкі** сельсавет, які выканаў плян на 11,6 проц. Гэта адзін з адстаючых у раёне, а калгас імя Дзяржынскага найбольш адстаючы ў Ардацкім сельсавеце. Калгас засеяў 35 га ільну і павінен здаць 125 цэнт. саломкі, 220 цэнт. ільнатрасты, 1 цэнт. валакна і 10 цэнт. пячыкі. Заданьне для калгасу зусім рэальнае, але лён узыняты са сьцеліч ляжыць, апрацоўка яго не пачата.

Старшыня калгасу **Карнілаў** прымае ўсе захады да таго, каб лён застаўся ў гаспадарцы, каб ніздзіліць яго паміж сабою і нічога ня здаць дзяржаве. Для таго, каб замаскаваць свае манэўры, гэты кулацкі агент выступае з наступнымі заявамі: «Пакі лён дрэнны, а таму і апрацоўваць яго ня трэба. Лепш скарыстаць на подсьпіл жывёле».

Гэтыя яўна-кулацкія тэорыі не сустракаюць адпору з боку сельсавету і кандыдацкай групы. Рад цьвёрдазаданьнікаў, карыстаючыся бязьдзейнасьцю сельсавету, таксама не здалі ні аднаго кілё ільну.

На К.-Лаўсману сельсавету здача валакна праходзіць надзвычайна марудныміі тэмпамі, таму, што на апрацоўцы ільну ў калгасах няма пастаянных вытворчых брыгад.

У буйнейшым ільнаводчым сельсавеце ў Нова-Брашчыне нядаўна набудован ільназавод. Але прыёмачны апарат заводу не аказае ніякай дапамогі сельсавету. Прыёмчыкі ільназаводу замест арганізацыі сартаваньня непасрэдна ў калгасе, чакаюць пакуль калгасьнікі самі прывязуць трасту. Прыёмка трасты робіцца няправільна. Тую трасту, якую па якасьці трэба прымаць першым нумарам, залічваюць поўнумарам. Гэта моцна б'е па інтарэсах ільназатмыкаў і грае на руку кулакам і іх агентам—правым апартуністам.

І—н.

ПЕРШЫЯ Ў РАЁНЕ

ДРЫСА. (Наш. кар.). Калгасы **«Перамога», «Полымя рэвалюцыі»** і камуна **«Верны шлях»** першыя ў Дрысенскім раёне выканалі свае абавязкі перад дзяржавай па здачы ільна-валакна.

Калгас **«Перамога»** датэрмінова скончыў уборку і апрацоўку ільну, не дапусьціўшы ні аднаго пракоўту страт. Датэрмінова калгас здаў і сваю ільнапрадукцыю дзяржаве, перавыканаўшы плян па трасьце на 1 тону 341 клгр. Большасьць здаваў трасты другога нумару.

Калгас **«Перамога»** з посьпехам выканаў і загатоўкі іншых відаў. Не атрымаўшы заданьня на збожжа, калгас усё-ж здаў 6 цэнт. і 80 клгр. Калгас ужо поўнасьцю выканаў заданьне на 1933 год па мясазагатоўках.

Калгас **«Полымя рэвалюцыі»** таксама перавыканаў плян па ільну. Большая частка заданай трасты выпешных нумароў.

Камуна **«Верны шлях»** выканала плян здачы ільнатрасты на 100 проц., а ільнапасеньня—на 200 проц. Камунары ўжо засылаюць насенныя фонды і прыступілі да разьмеркаваньня ўраджаю.

Такіх вынікаў перадавыя калгасы дабіліся дзякуючы правільнай арганізацыі працы і сапраўдкай барацьбы ільнаводчых брыгад за выкананьне сваіх вытворчых заданьняў.

М. Л.

Агенты кулацтва выключаны з партыі

СЯННО. (Наш спэцкар). Плян загатовак ільназалажа выкананы на раёне на 23 проц. За апошнія дні тэмпы загатовак зьнізіліся. 19 сьнежня на пунктах «Загатільну» было здана 60 цэнт., а 20—34 цэнт.

На апошнім месцы па здачы валакна знаходзіцца Малчанскі сельсавет (9 проц. выкананьня пляну) і Пустынскі сельсавет (15 проц.).

Старшыня Малчанскага сельсавету **Мурашка** за патураньне кулаком выключан ільну.

райкомам КП(б)Б з партыі.

За ад'езд у Менск без дазволу райкому ў самы разгар загатовак выключан з партыі сакратар Навасельскага сельсавету **Анціпенка.**

Старшыня райпрафсаюзу **Крумкач** за нявыезд у сельсавет па справе загатовак выключан з партыі.

Увесь партыйны і камсамольскі актыў ма білізаван на выкананьне пляну загатовак

Стальноў.

На прыкладзе Магілеўскага, Чашніцкага і Лёзьнянскага раёнаў ДА ТЭРМІНУ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН МЯСАЗАГАТОВАК

Што тармозіць мясазагатоўкі

На 20 сьнежня плян мясазагатовак чацьвертага кварталу выкананы па БССР усяго на 75,2 проц.

Тэмпы работы раённых загатоўчых арганізацый не забясьпечваюць сваячасовага выкананьня пляну да 25 сьнежня.

Асноўныя раёны, якія займаюць даволі значнае месца ў агульна-рэспубліканскім пляне, зрываюць цэнтралізаваны плян мясазагатовак. Напрыклад, Карманскі раён выканаў квартальны плян на 32,3 проц., Уваравіцкі — 36,4 проц., Гомельскі—41,1 проц., Жлобінскі — 41,3 проц., Чачэрскі — 41,5 проц., Рэчыцкі — 51,2 проц. і інш.

Асабліва адстаюць саўгасы Малпрамтрэсту і Сьвінатросту. Былы дырэктар Малпрамтросту Сыгрноў яшчэ ў лістападзе даў дырэктывы саўгасам свайго аб'яднаньня прадаваць мяса па канкурэнцыйных цэнах, у той час, як цэнтралізаваныя загатоўкі далёка ня выкананы.

Атрымаўшы такія дырэктывы пазасобныя саўгасы Брацкага раёну прадавалі жывёлу на рынку, а свой плян ня выконваюць.

Сьвінаводчыя саўгасы Чэрвеньскага раёну імя Будзённага і «Новыя Зялёнкі» да гэтага часу ня выконваюць сваіх заданьняў таму, што Сьвінавотрэст (тав. Жукаў) абяцаў ім зьнізіць плян

Яшчэ адзін факт. Саўгас «Маладая гвардыя» гэтага-ж раёну здае свае мяса чэмуесьці Асіпавіцкай канторы «Загатжывёла» па рынкавых цэнах, а раённым арганізацыям паведамляе, што здае на загатоўчых цэнах.

Апарат райкантор «Загатжывёлы» ў цэлым радзе месц засьмечан чужым элементам, які зрывае работу па загатоўках. Толькі за апошні час зьнята кіраўніцтва ў пяці раёнах (Полацак, Клічаў, Чачэрск, Карма, Уваравічы).

Аршанская кантора (загадчык **Крываносаў**) на працягу доўгага часу займалася ашуканствам. Яна сыстэматычна павялічвала процант фактычнага выкананьня пляну.

Такія-ж зьявішчы назіраюцца ў Чырвона-Слабодскім раёне (загадчык **Фрыдман**), у вестках фігуруе лішніх 80 цэнтн. Жытковіцкая кантора (загадчык **Рачкоўскі**) прыпісала ўзятых са столі 172 цэнтн.

Упаўнаважаныя «Белзагатжывёлы», якія зараз знаходзяцца ў раёнах, аказваюць вельмі слабую дапамогу мясцовым канторам па фарсаваньні загатовак.

Упаўнаважаны па Асіпавіцкім раёне тав. **Хейфэц** праехаў у адзін сельсавет і, назаўтра-ж вярнуўся назад, заявіўшы: «Цяжка праводзіць работу». І ён спакойна вярнуўся ў Менск.

Запазычанасьць элатчыкам мяса ў некаторых канторах даволі вялікая.

Асіповіцкая кантора (загадчык **Блохін**) увесь час здавала мяса Менскаму мясакомбінату бяз усякіх рахункаў і таму тропы, вядома, не атрымлівала. Запазычанасьць па канторы элатчыкам мяса складае некалькі тысяч рублёў.

Усе магчымасьці для сваячасовага выкананьня цэнтралізаванага пляну мясазагатовак ёсьць. Аб гэтым гаворыць вопыт работы Менскага, Мсьціслаўскага, Чашніцкага, Магілеўскага і інш. раёнаў, якія датэрмінова скончылі выкананьне пляну чацьвертага кварталу.

І.

Заданьні перавыкананы

ЧАШНІКІ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). ПАД БАЛЬШАВІЦКІМ КІРАЎНІЦТВАМ ЦК КП(б)Б НА АСНОВЕ РАЗГОРНУТАЙ МАСАВАЙ РАБОТЫ І БАРАЦЬБЫ З КУЛАЦКІМ САБАТАЖАМ ЧАШНІЦКІ РАЁН НА 21 СЬНЕЖНЯ ВЫКАНАЎ ПЛЯН МЯСАЗАГАТОВАК ЧАЦЬВЕРТАГА КВАРТАЛУ НА 101,4 ПРОЦ. УСЯГО ЗДАЧА 1.992 ЦЭНТ. МЯСА.

РК — КУРШ.

РВК — ПАЛОК.

Райзагатжывёла — НІСЬНЕВІЧ.

***

МАГІЛЕЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). НА 21 СЬНЕЖНЯ МАГІЛЕЎСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛЯН МЯСАЗАГАТОВАК НА 101 ПРОЦ. ЗАМЕСТ 3.077 ЦЭНТ. ЗДАНА 3.109 ЦЭНТ. КАНТОРА ПЕРАКЛЮЧЫЛАСЯ НА ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ 1933 Г.

РК — КАЛОДКА.

РВК — САПРЫЦКІ.

Загатжывёла — ЛЕВІН.

***

ЛЕЗНА. ПЛЯН ЧАЦЬВЕРТАГА КВАРТАЛУ МЯСАЗАГАТОВАК НА 19 СЬНЕЖНЯ ВЫКАНАН НА 106,2 ПРОЦ. УСЯГО ЗДАНА 1.934 ЦЭНТ. ЗАГАТОЎКІ МЯСА ПРАЦЯГВАЮЦЦА.

Зруху яшчэ няма

ГОМЕЛЬ. Мясазагатоўкі зьяўляюцца самым адсталым участкам у раёне. Наогул, гэтаму пытаньню здаецца вельмі мала ўвагі.

Былое кіраўніцтва канторы «Загатжывёлы» сваёй бязьдзейнасьцю фактычна зрыхвала выкананьне пляну. Нова-прызначаны кіраўнік тав. Гірошык тлумачыць адставаньне тым, што ён працуе ўсяго два тыдні і ўсё «знаёмляецца» з работай.

На 20 сьнежня плян чацьвертага кварталу выкананы усяго на 41 проц.

За дзённы ход мясазагатовак Гомельскі раён занесен «Зьвяздой» на чорную дошку, адпаў, гэта нікога ня турбуе. Належнага зруху на сёнешні дзень яшчэ няма.

Такія сельсаветы, як Дзятлавіцкі, Клімаўскі, Міхальчаўскі, Сяўрунаўскі, Прыбытнаўскі, Жгунскі і Забраўскі нават яшчэ не прыступілі да выкананьня сваіх планаў.

«Кіраўнікі» гэтых сельсаветаў займаюцца апартуністычным разважаньнем аб тым: «пляны нерэальныя, няма чаго здаваць».

На справе-ж за гэтымі апартуністычнымі шырмамі хаваецца простае нежаданьне ня менньш мабілізаваць масы на выкананьне важнейшай палітычнай кампаніі

Пастанова ЦК і СНК аб мясазагатоўках у гэтых сельсаветах не даведзена да шырокіх мас калгасьнікаў і працоўных адпасобнікаў. Пляны за цвёрдо былі даведзены з вялікім спазьненьнем.

Мільчанскі сельсавет з 78 цэнтн. па пляну здаў толькі 3,1 цэнтн. Гэты сельсавет застае па ўсіх гаспадарча-палітычных ко пляніях.

СТФ таксама яшчэ ня выканалі свой плян. З 40 цэнтн. здана 32,3 цэнтн

И. Г.

І. А. ЛЫЧОЎ

НЯЎХІЛЬНА АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЬ ЗАКОНЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

Партыйныя, прафсаюзныя арганізацыі, саветы і пад іх кіраўніцтвам уся краіна грамадзкасьць за апошні час правялі вялікую работу па ахове сацыялістычнай уласнасьці і ўзмацненьні рэвалюцыйнай законнасьці.

Папулярызацыя і ажыцьцяўленьне вядомых пастаноў партыі і ўраду (ад 25-VI і 7-VIII—32 г.) спрычыніла павышэньню актыўнасьці працоўных мас у іх барацьбе са скажэньнямі лініі партыі, з клясовым ворагам, за рэвалюцыйную законнасьць, за ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту.

У рэзультаце правяденай работы ў радзе раёнаў выкрыты факты палітычных і крымінальных злачынстваў — «лявацкія» загібы, раскраданьне калгаснай маемасьці і г. д. Палепшыў сваю дзейнасьць судова-сьледчы апарат. Да яго работы прыцягнуты сотні і тысячы працоўных. Ажывіўся рух камсамольскай «лёгкай кавалерыі».

Відавочна, што на гэтым вучастку дасягнут значны зрух, праведзена вялізарная работа. Але гэтыя зрухі, гэты ўдым на фронце ажыцьцяўленьня рэвалюцыйнай законнасьці ня ўсюды яшчэ замацаваны.

Таму задача партыйных арганізацый, органаў КК-РСІ, саветаў, прафсаюзаў настойліва працягваць пачатую работу, усямерна яе развіваць.

У першую чаргу мы абавязаны даклапаціцца растлумачыць кожнаму рабочаму, кожнаму калгасьніку і працоўнаму адпасобніку, кожнаму працоўнаму сутнасьць рэвалюцыйнай законнасьці, яе значэньне.

«Неабходна, — вучыў нас Ленін, — захоўваць сьвята законы і прадпісаньні савецкай улады і сачыць за іх выкананьнем усім». **У гэтым зараз галоўнае.**

Да ўдзелу ў ахове сацыялістычнай маемасьці, у ажыцьцяўленьні рэвалюцыйнай законнасьці трэба прыцягнуць самыя шырокія масы працоўных. Толькі тады ўсякі замкоя савецкай улады будзе ажыцьцяўляцца на мясцох поўнасьцю і паўхільна.

Гэта ніколькі ня зьніжае (як могуць палумаць прастакі і апартуністы) ролі органаў юстыцыі і КК-РСІ.

Наадварот, іх роля значна ўзрастае ня толькі ў сэнсе кантролю, як правадніцкоў рэвалюцыйнай законнасьці, але як арганізатара мас для ўдзелу ў гэтым кантролі.

Ёсьць людзі, якія схільны разглядаць нашу рэвалюцыйную законнасьць, як непатрэбны атрыбут, як зжыўшую сябе справу. Гэтыя людзі не разумеюць або ня хочуць разумець, што «рэвалюцыйная законнасьць ня ёсьць пустая фраза. Рэвалюцыйная законнасьць зьяўляецца адным са сродкаў умацаваньня пралетарскай дыктатуры, дыктатуры абароны інтарэсаў працоўных, рабочых і сялян у барацьбе з клясавым ворагам працоўных» (Сталін).

Ня цяжка зразумець, што такія цьвярджаньні аб непатрэбнасьці ажыцьцяўляць рэвалюцыйную законнасьць, вынікаюць з правапартуністычных «тэорыек» аб мірным урастаньні кулака ў сацыялізм, аб адмаранні ні клясаў без зацятай барацьбы, так сказаць, самацёкам.

З правымі апартуністамі, якія найбольш яркаадлюстроўваюць ідэалёгію і памкненьні кулацтва, а таму і зьяўляюцца галоўнай небясьпекай — з імі ў канечным лику зыходзяцца «левакі». «Лявацкія» элементы прадпісваюць адмірацьце пралетарскай дзяржавы, права, гропай, ужо зараз, на данай стадыі сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэтыя «тэорыйкі» на практыцы вядуць да разьвенчаньня пралетарскай дыктатуры, узмацненьня пазыцый кулацтва, стварэньня ўмоў для ростаўрацы капіталістычнага ладу.

Партыя з усёй сілай бальшавіцкай непрымірымасьці ўдарыла па гэтых махровых ідэйках кулацкіх ідэалёгаў. Мабілізуючы ўвагу і энэргію рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных яшча партыя настойліва праводзіць палітыку разгорнутага сацыялістычнага наступленьня, палітыку ліквідацыі кулацтва як класы, палітыку, якая кіравана на разгром рошпак капіталістычных элементаў і ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту.

Палітыка нашай партыі зьяўляецца адзіна правільная — ленінская.

Зараз пры абвостранай клясавай барацьбе, калі кулак шукае малейшых дзірак, шчы лінак, каб пролезьці ў іх, нашкодзіць савецкай дзяржаве — працягнуць сваё існаваньне — у гэты перыяд размовы аб клясавым міры, аб ліквідацыі ўсякага права, зьяўляюцца простай здрадай справе рабочай клясы.

Ня так даўно выкрыты прарывы па ахове рэвалюцыйных законаў у Лельчыцах, Петрыкове, Рэчыцы і некаторых сельсаветах іншых раёнаў. Выкі гэтых прарываў вельмі цяжкія.

У чым тут справа? Чаму дайшлі да гэтага? Зразумела, што пры аналізе прычын гэтых прарываў ня можа быць гутаркі, што тут памылкі асобных таварышоў. Не Іваноў ці Пятроў аказаліся дрэннымі людзьмі, а ўвесь кіруючы апарат гэтых раёнаў як партыйны, так і савецкі, сталі на няправільны шлях—на шлях грубейшых скажэньняў савецкіх законаў. Кіраўніцтва паказаных раёнаў у сваёй дзейнасьці праводзіла процілеглую бальшавіцкай лінію — лінію апартуністаў — кулацкіх падсобнікаў. Яны на практыцы ажыцьцяўлялі тыя апартуністычныя «тэорыйкі» і «ідэйкі», аб якіх мы гаварылі вышэй. Замест правадзеньня палітыкі ліквідацыі кулацтва яны праляўлялі да кулака мяккацелаасьць і разам з тым груба адміністравалі ў адносінах да беднака і серадняка.

Бакакоўныя дзеяньні—масавыя вобыскі, штрафы, арышты кулацкія перараджаюцца з кіраўніцтва тлумачылі «рэвалюцыйнай мэтазгоднасьцю».

На партыйнай мове, у нашым бальшавіцкім пашыраным сэнсе — рэвалюцыйная мэтазгоднасьць азначае правільна ажыцьцяўляць савецкі закон у даны перыяд, у даных умовах. Рэвалюцыйная мэтазгоднасьць, значыцца, мяркуе правільнае праведзеньне нашых законаў.

І толькі людзі, якія заведама працуюць на карысьць кулака, могуць апраўдваць гэты тэрмін для таго, каб прыкрыць сваю антыпартыйную, процілеглую дзейнасьць.

ЦК КП(б)Б і ЦКК далі вычарпальную палітычную ацэнку ўсіх гэтых спраў, выявілі кіраўніцтва, узмацавалі раёны работнікамі. Але нават і пасьля гэтага ёсьць сьвядомы, што асобныя людзі з Пятрыкоўскага, Талочынскага, Лепельскага раёнаў пакаюцца і зараз на практыцы дастаўляюць сваю апартуністычную «мэтазгоднасьць».

Аб палітычнай сутнасьці гэтага «лявацкага» «дастасаваньня» вельмі выразна гавораць самі факты. Старшыня сельсавету **Жураўскі** (Пятрыкоўшчына) член партыі, незаконна арыштоўвае сялянку, усялякі запалохвае яе. Загатчык Дому сацыялістычнай культуры, кандыдат у члены КП(б)Б, забірае без усякага на гэта права карову ў серадняка.

Лельчыцкая КК-РСІ ня так даўно выявіла, што судова-сьледчы апарат сам скажае законы. У судзе ляжаць пераглядженымі больш 400 спраў. За ўвесь 1932 г. не разглядзена ні адна кулацкая справа. Яны завешаны, але марынуюцца. Такую работу нельга разглядаць, як просты залек. Тым больш, што суд за гэты час разглядзеў шмат дробных спраў: аб забойстве курыцы, аб тым, што адзін грамадзянін другога пхнуў, адзін у другога выбіў ложку і г. д. Пэўную палітычную сьлепоту правяла і РВК РСІ. Яна толькі ў апошні час сур'ёзна ўзялася за гэтую справу.

Дрэнную работу судова-сьледчага апарату прыходзіцца адзначаць ня толькі па Лельчыцкаму раёну. І ў іншых асобных мясцох ён не праяўляе патрэбнай палітычнай пільнасьці, не разгортвае патрэбнай работы. Гэта датычыць асабліва растлумачэньня законаў і апошніх пастаноў ураду.

Мерапрыемствы, якія праводзіцца партыяй і ўрадам на вёсцы, актывізуюць кулацкі элемэнт. Загатоўкі збожжа, мяса, ільну, мабілізацыя сродкаў праходзіць у абстаўнках абвостранай клясавай барацьбы, у абставінах жорсткага супраціўленьня падабітых яшчэ рошпкаў капіталістычных элементаў. Кулак ня здасьцца без бою, ён ужывае розпастайныя формы і мэтады падпольнай работы.

Вось, напрыклад, у **Пухавіцкім** раёне (Увяцвенскі сельсавет) кулак **Кацаневіч** і падпольны адвакат **Марута** ўзяліся «растлумачваць» пастанову ўраду аб рэвалюцыйнай законнасьці. «Усіх сельсаветчыкаў, —кажуць яны,—арыштуюць і будуць судзіць, а індывідуальнае абкладаньне і цьвёрдыя заданьні зьнімаюцца».

На кулацкую вудачку палчас пападаюць некаторыя сельсаветчыкі і нават асобныя камуністы. Нельга па-за сумневаю з гэтай агітацыяй разглядаць такія факты, як адмена ўсіх цьвёрдых заданьняў Быхаўскім сельсаветам, скасаваньне ўсіх штрафаў Слабодзкім сельсаветам гэтага-ж раёну. Характэрна, што ў паказаных сельсаветах раней былі «лявацкія» загібы, а пад уплывам кулацкай агітацыі работнікі шарахнуліся ўправа.

Прыкрываючы сваю крывавэрнасьць, кулак прапагандуе «клясавы мір», г. зн. сваё клясавае панаваньне. Прыхільнікаў гэтага «міру» ён знаходзіць у тварах апартуністаў, эрзацнікаў. Яркім прыкладам такога «мірнага суіснаваньня з кулакам» абароны яго інтарэсаў зьяўляецца справа б. сакратара Жлобінскага райкому КП(б)Б Жыдзікова.

Партыя з усёй сілай біла і будзе біць па эрзацніках, па апартуністычных «тэорыйках» і практыцы.

З такой-жа сілай і настойлівасьцю мы павінны ажыцьцяўляць рэвалюцыйную законнасьць, бо яна «зьяўляецца адным з важнейшых сродкаў умацаваньня пралетарскай дыктатуры, абароны інтарэсаў рабочых і працоўных сялян і барацьбы з клясавым ворагам працоўных (кулактвам, перакупшчыкамі-спэкулянтамі, буржуазнымі нацыяналістамі) і іх контр-рэвалюцыйнай палітычнай агентурай». (З пастановы ЦВК і СНК СССР).

Змагаючыся з «лявацкімі» загібамі, адміністраваньнем, мы ня можам у інтарэсах працоўных, у інтарэсах пралетарскай дзяржавы дапусьціць якое-б там ні было патураньне кулаку, клясаваму ворагу. А факты такога патураньня, мяжкацелаасьці да шкодніцкіх дзеяньняў варожых элементаў яшчэ маюць месца ў асобных сельсаветах.

Вось, напрыклад, у Целяшэўскім сельсавеце (Пранойскі раён) кулак Луп'янчыкаў сабатуе дзяржаўнае заданьне, а бульбу прадае спэкулянтам. Яго ня судзяць. Тое-ж самае ў Чарнушэўскім сельсавеце. Старшыня Гаспадзкага сельсавету зросься з кулакамі і вызваліў іх ад цьвёрдых заданьняў.

У **Полацкім, Аршанскім і Лагойскім** раёнах некаторыя сельсаветы вызвалілі многіх кулакоў ад цьвёрдых заданьняў па мясе. Можна было-б прывесьці яшчэ рад фактаў, якія гавораць аб скрыўленьнях клясавай лініі, патураньні кулаку асобнымі низавымі работнікамі. Самае горшае, што гэтыя факты іншы раз доўга знаходзяцца ў цені, незаўважанымі раённай пракуратурай і РВК-РСІ.

Задача органаў юстыцыі і рабоча-сялянскай інспэкцыі—**поўнасьцю выкарыстоўваць нашу рэвалюцыйную законнасьць.** Трэба з усёй суровасьцю караць кулацкія элементы—сабатажнікаў заданьняў дзяржавы і, зразумела, ня гладзіць па галоўцы іх агентаў, ідэолёгаў і хадатаў, якія часамі пралазяць у сельсавет і нават у рады нашай партыі.

ЦВК і Саўнарком Саюзу ў сваёй пастанове ад 25 чэрвеня «зварочваюць увагу ўсіх мясцовых органаў савецкай улады і пракуратуры на тое, што задача суровага захаваньня рэвалюцыйнай законнасьці ў адносінах калгасаў і ўсёй масы калгасьнікаў зьяўляецца задачай асаблівай важнасьці ва ўмовах, калі большасьць працоўнага сялянства аб'ядналася ў калгасы».

Гэту акалічнасьць прыходзіцца яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліць, выцягнуць таму, што клясавы вораг лёзе сваёй шкодніцкай работы на вёсцы пакроўвае супроць калгасу, супроць яго гаспадарча-палітычнага ўмацаваньня.

Абавязак пракуратуры, органаў КК-РСІ, як і ўсёй партыйнай арганізацыі ня толькі перасякаць у корані простыя шкодніцкія акты кулацтва, імкненьні разлажыць калгас, раскрадваць яго маемасьць, але не дапускаць якога-б там ні было безаконнага дзеяньня з боку прадстаўнікоў мясцовых улад. **Чэрвякаўскі** сельсавет, на прыклад, (Дзяржынскі раён) у адміністрацыйным парадку ўвёў у склад праўленьня брыгадзіра РВК. Старшыня **Баршэўскага** сельсавету, Камарынскага раёну, самаўласна выключыў бедняцкоў і серадняцкоў з калгасу. Загатчык **Заслаўскага** райсаюзу без згоды калгасьнікаў даў загад адрозаць кавалак іх зямлі і разьмеркаваць паміж адпасобнікамі.

Не дапускаць падобных скажэньняў, таксама як і не дапускаць адміністраваньня ў адносінах да адпасобнікаў, бедняцкоў і серадняцкоў—**первейшы абавязак РСІ і органаў юстыцыі.**

Асабліва шкода, што ў гэна трэба канцэнтраваць штрафную палітыку асобных сельсаветаў. Цэлы ці ліцці найменшага супраціўленьня, асобныя работнікі злоўжываюць кіраўнымі ім правамі, перавышаюць гэтыя правы. Зарэгістраваны таксама не адзін факт абкладаньня цьвёрдымі заданьнямі сем'ю чырвонаармейцаў. У практыцы работы некаторых сельсаветаў сустракаемся з фактамі, калі штрафуюць за глушэньне бешкіна на 30-50 руб. і на такую-ж суму штрафуюць кулака за сабатаж заданьняў дзяржавы. **Тут відавочна апартуністычная дзейнасьць на карысьць кулака, на шкоду сацыялістычнага будаўніцтва.**

Асобна трэба спыніцца на ажыцьцяўленьні дэкрэту ўраду аб ахове сацыялістычнай уласнасьці.

Найраз ці трэба даказваць вялізарнейшае палітычнае значэньне гэтага дэкрэту. Ленін яшчэ ў 1918 г. на канфэрэнцыі маскоўскіх прафсаюзаў гаварыў, што толькі «лягуценьнікі, інтэлігенты, дробна-буржуазныя сацыялісты, яны думалі, можа быць думаюць і мараць аб тым, што сацыялізм удасца ўвесьці шляхам перакопаньня. Перакананьне большасьці народу, калі яна пераканаецца—меншасьць паслухаецца, большасьць прагаласуе і сацыялізм будзе ўведзены. Не, так нічасьліва зямля не пабудавана. Эксплёататары, сьверы-памешчыкі, капіталістычная кляса пераканаць ню не падаюцца. Сацыялістычная рэвалюцыя пацьвярджае тое, што бачылі ўсе—вялізарнае супраціўленьне эксплёататараў. Чым мацней пашкі прыгнечаныя клясаў, чым бліжэй падыходзіць яны да таго, каб сьвяцнуць усякае прыгнечаньне, усякую эксплёатацыю, тым больш шалёным становішча супраціўленьне эксплёататараў».

Гэтае палажэньне Леніна пацьвярджалася асабліва выразна

СЭСІЯ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

Мабілізацыя навукі на павышэньне ўраджаю

Прамова прэзыдэнта Акадэміі Навук Беларусі тав. П. О. Горына

При адкрыцьці сэсіі Акадэміі Навук БССР, акадэмік **П. О. Горын** ў сваёй прамове зазначае, што пытаньне павышэньня ўраджайнасьці сацыялістычнага земляробства, якому прысьвечана сэсія, мае вялізарнае палітычнае і практычнае значэньне.

Нельга ні на мінуту забываць, — кажа тав. Горын,—што вялізарная гістарычная задача індустрыялізацыі нашай краіны можа быць вырашана толькі пры ўмове сацыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Нельга таксама забываць, што барацьба за індустрыялізацыю, гэта барацьба за ўмацаваньне сувязі пралетарыяту з бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства ва ўмовах рэконструкцыйнага перыяду.

— Адпак, трэба заўважыць,—указвае тав. Горын,—што сярод навуковых працаўнікоў ня ўсе яшчэ асвоілі і зразумелі бальшавіцкую азбуку рэконструкцыйнага перыяду, што індустрыялізацыя і калектывізацыя гэта два бакі аднэй мэдалі. Ня ўсе разумеюць, што толькі ў нашай далейшай рашучай барацьбе за індустрыялізацыю і калектывізацыю зарука поўнай перамогі сацыялізму, што другога шляху пабудовы сацыялізму няма і быць ня можа.

Калі я гавару «ня ўсе разумеюць», дык я меню за ўсё маю на ўвазе тэхнічную няпісьменнасьць у гэтым пытаньні. Вельмі часта напісьменны калгасьнік у гэтых пытаньнях разьбіраецца куды лепш за вучонага экаміста. Гэта пісьменнасьць, так сказаць, клясавая парадку. Лепшым паказальнікам гэтага зьяўляюцца працянал-дэмакраты,—партыя кулацкай капіталістычнай контр-рэвалюцыі.

Пры складаньні першай пяцігодкі БССР нацэнцы прызнаваліся, што «дарэвалюцыйнае земляўпарадкаваньне», так званае «стальпінскае» (гэта слова яны нават рушылі ва ўмілі ў двукосьсе) захапіла плошчу ў 784.542 дзесяціны, якая зьяўляецца палкам земляўпарадкаваньняў і не патрабуе ніякіх дадатковых капіталаў-земляўпарадчых дзеяньняў. («Пэрспэктыўны плян разьвіцьця сельскай і лясной гаспадаркі БССР», стар. 142, 1927 г.).

Гэтым кулацкім установам камуністычная партыя дала рашучы адпор і дабілася таго, што за апошнія гады БССР ператвараецца ў адну з перадавых частак Савецкага Саюзу. Лепшым паказальнікам гэтага зьяўляецца тэмп індустрыялізацыі БССР. У той час, як па ўсяму саюзу ў сярэднім гадавы процант індустрыялізацыі роўны калі 23 проц., у БССР ён дасягае 57 проц.

У сілу правільнасьці палітыкі КП(б)Б мы зараз можам ганарыцца буйнымі дасягненьнямі ў галіне эканамічнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Пастаўленыя перад намі задачы сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць ад нас ні на мінуту ня спыняць самай бязьлітаснай барацьбы з тымі, хто імкнецца рэвізаваць генэральную лінію партыі, хто стараецца перашкодзіць нашай барацьбе за далейшую індустрыялізацыю і калектывізацыю, вядучы барацьбу супроць вялікадзяржаўніцкіх і нацыянал-дэмакратычных установак. Ні на мінуту нельга забываць, што клясавая барацьба ў наш час прымае самыя вострыя формы. У нашых умовах, калі ў БССР калектывізавана каля паловы сялянскіх гаспадарак, у вёсцы ідзе жорсткая клясавая барацьба.

Контррэвалюцыйныя сілы пры ўсялякім сярыёзным выпадку надымаюць галаву, зарадзіўшыся на густу ў вопратку—вялікадзяржаўных шавіністаў, або нацыянал-дэмакратаў. Як відома, паны Цьвікевічы, Луцкевічы з адноўкавай любоўю маглі цалаваць боты рускага, нямецкага, або польскага імпэрыялізму. Наша задача, цільна стоячы на варце пралетарскіх інтарэсаў, зрываць маску з клясавага ворага, паказваць яго сапраўдны твар і выкрываць усякага роду перараджэнцаў, якія з партыйным білетам ў кішэні дыскредытуюць назву члена камуністычнай партыі з адпрываюць справу пралетарыяту. Мы павінны таксама ўзмацніць нашу барацьбу супроць прымірэнчых адносін да апартуністаў.

Нашы клясавыя ворагі ня спыняюцца ні перад якімі прыёмамі барацьбы. Часта прыкрываючыся фальшыва-нацыянальнымі сьцягамі, яны ўсялякімі мерамі стараюцца падарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва, зрываючы загатоўкі, накідаючы незасеянымі палі, зьмяшчаючы жывёлу і насеньне.

Ня гледзячы на ўсе подлыя прыёмы нашых ворагаў пытаньне «хто каго» ўжо канчаткова вырашана ў карысьць сацыялізму, як у горадзе, так і на вёсцы. Правільная палітыкай камуністычнай партыі пабудован моцны фундамант сацыялістычнай эканомікі. Вы ведаеце, што больш ста тысяч трактараў працуе на палёх СССР. Вы ведаеце, што нябачныя ў сьвеце хімічныя камбінаты ў Салікамску, Бярэзьніках і іншых часьцях Савецкага Саюзу даюць савецкім палём мінэральныя ўгнаеньні, забясьпечваюць падём прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі і зьнішчаюць векавую галечу шматмільённых мас рабочых і працоўных сялян.

Перавага аграмаджанай сельскай гаспадаркі зараз ужо даказана ня толькі тэарэтычна, але і практычна. Ужо ў 1930 г. аграмаджаны сэктар у Савецкім саюзе параўнальна з аднасобным даў павышэньне па пшаніцы на 38 проц. па збожжы на 20 проц. Мы ў БССР таксама ў радзе калгасаў можам канстатаваць посьпехі. Напрыклад, калгас «Сталінец», Капыльскага раёну, у бягучым годзе ў сярэднім сабраў з га 12 тон бульбы, у той час, як аднаасобнік 9 тон.; калгас «За ўраджай», Асіпавіцкага р-ну атрымаў 19 тон бульбы, у той час, як аднаасобнік 9 і г. д. Праўда, можна прывесьці рад калгасаў, у якіх ураджайнасьць ніжай аднаасобнага сэктару, але гэта ні ў якай ме-

УДЗЕЛЬНІК СЭСІІ

Вучоны-спэцыяліст тав. ДАРОЖКІН.

ры не памяншае правільнасьці палажэньня, што перамога за сацыялістычным сэктарам забясьпечана. Стракатасьць карціны ўраджайнасьці па пасобных калгасах сьведчыць толькі аб жорсткай барацьбе сацыялістычнага і аднаасобнага сэктару ў сельскай гаспадарцы, але ў гэтай барацьбе мы з кожным днём атрымліваем усё новыя і новыя посьпехі.

У гэтай барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю нашай народнай гаспадаркі навуцы належыць не апошняе месца. Вядома, што ў свой час перамогі буржуазіі над фэўдалізмам была забясьпечана тым, што буржуазія пырвала скарыстала навуку. Паравая машына Уайта, мэханічны варштат Картрайта, прадзільная машына Крамптона, вынаходства бацькі хімі Лявуазье, матэматычныя законы Карыё і шмат іншых прадстаўнікоў навукі таго часу забясьпечылі перамогу буржуазіі над фэўдалізмам.

Тым большую ролю навука павінна адыграць у пабудове сацыялізму, як адзінай грамадзкай сыстэмы, якая забясьпечвае свабоднае разьвіцьцё і бурны рост навукі.

Хто быў на Кастрычніцкай дэманстрацыі, напэўна помніць, што амаль кожная арганізацыя несла лёзунг «Аўладаем тэхнікай». А ці-ж ня гучыць трохі кур'ёзна, што па адкрыцьці нашай канфэрэнцыі па выпрацоўцы плянаў навуковай работы ў другой пяцігодцы міліцыя ахоўвала ўваход на пасяджэньне таму, што мы на былі ў стане задаволіць жаданьне многіх прысутнічаць на ёй. Гэта вельмі сымптаматычна, гэта паказальнік, што шырокія масы ўсьвядомілі, што навука і сацыялізм неадлучны адзін ад другога. Гэта з другога боку на кожнага з нас, працуючага на вучастку навукі, кладзе вялікую адказнасьць. Пытаньне аб павышэньні ўраджайнасьці гэта ня сутнасьці рашаючае пытаньне ў справе канчатковай перамогі сацыялістычнага сэктару ў вёсцы. Высокі ўраджай сацыялістычных палёў зьяўляецца лепшай зарукай канчатковай перабоўкі дробнага аднаасобнага сялянства, гэтай крыніцы многавяковай галечы бедняко ў і серадняко ў, крыніцы кулацкай кабалы.

На нашай сэсіі пастаўлены асноўныя пытаньні сацыялістычна-тэхнічнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Беларуская Акадэмія Навук павінна, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у нагу з рабочай клясай, калгасьнікамі і бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства па-бальшавіцку змагацца за ўраджай.

Вядома, якія вялікія пэрспэктывы стаяць у гэтай галіне—навучыць масу аўладаць зброяй павышэньня ўраджайнасьці. Цэлы рад самых простых мерапрыемстваў ужо даюць высокі ўраджай. Напрыклад, правільнае вы карыстаньне мінэральнага ўгнаеньня зможа павысіць ураджайнасьць на 150 проц., правільны севазварот, нармальны тэрміны пасеву, умелая барацьба з сьмяцьцёвымі расьлінамі таксама павышае ўраджай амаль у два і г. д.

Сучасная сэсія Акадэміі Навук павінна будзе сказаць сваё аўтарытэтнае слова, як практычна павысіць ураджайнасьць на ўмовах БССР. Гэты практычны бок павінен прасякнуць ва ўсю работу нашай сэсіі.

У заключэньне я хацеў-бы адзначыць, што гаворачы аб зямлі і прыродзе, мы не павінны забываць чалавека. Узброіць людзей ведамі, умець даць ім гэтыя веды, весьці барацьбу за перавыхаваньне і стварэньне сацыялістычнага працаўніка нашых палёў —гэта задача таксама ва ўвесь рост стаіць перад Акадэміяй Навук, як навуковым цэнтрам БССР і цэнтрам беларускай сацыялістычнай культуры. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы на вучастку навукі дасягнулі буйных посьпехаў. Толькі гэта кіраўніцтва забясьпечвае нам далейшы бурны рост.

Нахай жыве камуністычная партыя, якая ў штодзённай рашучай барацьбе з усякага роду апартуністамі пераможна будуе сацыялізм!

Нахай жыве правадыр камуністычнай партыі, лепшы вучань Леніна—тав. Сталін!

Нахай жыве сацыялістычная навука!

Дзеньнік работы сэсіі

На вячэрнім пасяджэньні сэсіі 22 сьнежня вучоны спэцыяліст тав. ГАНЧАРЫК выступіў з дакладам «ПРАБЛЕМА НОВЫХ КУЛЬТУР У БССР».

23 сьнежня сэсія заслухала даклад вучонага спэцыяліста тав. ШЫПЕРКА аб НОВЫХ КУЛЬТУРАХ НА АСУШАНЫХ БАЛОТАХ У БССР. У абгаварэньні пытаньняў, пастаўленых дакладамі т. т. Ганчарыка і Шыперка, прынялі ўдзел т. т. ДЗЯНІСАЎ, СЯРГЕЕВА, СТРАГОВІЧ, ЕРМАШЭВІЧ, ФЯДЗЮШАН, ГЕЛЕР.

Таксама на гэтым пасяджэньні прызыдэнт Акадэміі Навук АКАДЭМІК П. О. ГОРЫН даклажыў сэсіі ВЫТВОРЧЫМ ПЛЯНЕ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧАЙ РАБОТЫ АН НА 1933 ГОД. Пасьля былі заслуханы і ўхвалены матар'ялы і практычныя прапановы камісій па кожнай прапрацаванай тэме. На аснове ўхваленых сэсіяй матар'ялаў, Наркамземам рэспублікі і другімі ўрадавымі органамі будуць прыняты ўзаконеньня мерапрыемствы па павышэньні ўраджайнасьці.

23 сьнежня сэсія Акадэміі Навук, прысьвечаная павышэньню ураджайнасьці, скончыла сваю работу. Акадэмік ГОРЫН, закрываючы сэсію, адзначыў вялікую ролю работ, праробленых сэсіяй, за чатыры дні сваёй працы.

Наша Акадэмія,—кажа тав. Горын,—практычна ўключылася гэтай сэсіяй у вялікую ба барацьбу ўсяе краіны па павышэньні ураджайнасьці сацыялістычнага земляробства. Трэба прыкласьці ўсе нашы намаганьні, мабілізаваць усе сілы і сродкі навукі, каб намечаныя практычныя мерапрыемствы правесьці ў жыцьці. Нашай сэсіі мы НЕ КАНЧАЕМ, а толькі ПАЧЫНАЕМ РАЗГОРНУТУЮ РАБОТУ УСІХ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ ПА ПАВЫШЭНЬНІ УРАДЖАЙНАСЬЦІ САЎГАСНЫХ І КАЛГАСНЫХ ПАЛЁЎ. У самыя бліжэйшыя часы мы павінны будзем склікаць цэлы рад навуковых канфэрэнцый і нарадаў для прапрацоўкі пасобных пытаньняў павышэньня ўраджайнасьці, якія паўсталі на гэтай сэсіі.

Прэзыдэнт Акадэміі тав. ГОРЫН сваю за-

УДЗЕЛЬНІК СЭСІІ

Акадэмік усесаюзнай акадэміі навук тав. КУЛАГІН.

ключную прамову канчае наступнымі словамі:

— У НАС ЎЗРАС ВЯЛІКІ, ПРАЦАЗДОЛЬНЫ КВАЛІФІКАВАНЫ КАЛЕКТЫЎ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ ПА ПЫТАНЬНЯХ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ. НАМІ ПРАРОБЛЕНА ВЯЛІКАЯ НАВУКОВАЯ РАБОТА. ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, У САМАЙ ЦЕСНАЙ СУВЯЗІ З РАБОЧАЮ КЛЯСАЙ, КАЛГАСНЫМІ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІМІ МАСАМІ МЫ З ПОСЬПЕХАМ ВЫКАНАЕМ УСЕ ПАСТАЎЛЕНЫЯ ПЕРАД НАМІ ЗАДАЧЫ.

Пастанова ПК ЦКК КП(б)Б ад 20-XII 1932 г.

МАЛЫГА М. П., член КП(б)Б з 1920 г., служачы, ст. інспэктар Наркамправы.

За адмаўленьне выказань пастанову ПК КП(б)Б аб пасадзы на працу ў Талачынскі раён старшынёй рэвкалегіі суду, чым грубя парушыў партдысцыпліну—з радоў партыі выключыць.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б ДАМБРОЎСКІЙ.

Пастанова ПК ЦКК КП(б)Б ад 22-XII 1932 г.

РАТНЭР Б. Я., член КП(б)Б з 1924 г., служачая, дачка гандляра, б. сьледчы па галоўных справах НКЮ.

За праяўленьне гнілога лібералізму да жулікаў, разьмятаючых загатоўчы апарат шляхам хабараў, і да хабарнікаў Слуцкай канторы шкодагародніны, зьмякчыўшы абвінавачаньне і вызваліўшы іх з-пад варты,—з радоў партыі выключыць.

Указаць тав. Файнбэргу — нам. наркома НКЮ—на неўстрачальны нагляд за гэтай справай.

Член ПК ЦКК КП(б)Б СЬВЯРДЛОВА.

„Будзем павышаць тэмпы барацьбы за пяршыства"

(На сходзе чыгуначнікаў Менскага дэпо)

Конкурс на транспарце ў разгары. Мэтадам сацыялістычнага спаборніцтва перажывае чыгуначнікі змагаюцца за пяршынства, паказваюць узоры ўдарнай барацьбы за плян перавозак.

Прайшло 15 дзён конкурсу. Яшчэ няма чым асаблива пахваліцца, яшчэ не дасягнут выстарчальны пералом у рабоце, але ў балянс раду брыгад ужо занесены бліскучыя паказальнікі перамог.

Пашырыць вопыт перадавых, улічыць першыя недахопы ходу конкурсу з тым, каб іх неадкладна зьнішчыць,—важнейшая задача дня. Іменна з гэтай мэтай 19 сьнежня быў скліканы агульны сход рабочых, служачых і ІТР Менскага вузла.

Вынікі работы Менскага вузла за 15 дзён конкурсу паказваюць, што не на ўсіх вучастках яшчэ адноўкава ўпартае змаганьне за перамогу.

Пэўныя посьпехі дасягнуты дэпо ў зьмяншэньні ліку хворых паравозаў. Пры заданьні ў 15,3 проц. дэпо мела за 15 дзён сьнежня 13,71 проц. Аднак гэтыя лічбы ня могуць ні ў якім разе дэмабілізаваць увагу рабочага калектыву вузла. Далёка ня ўсё яшчэ зроблена, каб сапраўды адкравіць паравозны парк. У дэпо ня зжыты элемэнты нядбайнасьці і безадказнасьці. Як інакш назваць такія факты, калі па запісу машыністаў рамонт сыстэматычна не правоцвіцца? На паравозе ЩІ-3144 па запісу машыніста ня быў выканан рамонт інжэктару і ня была пастаўлена шайбка ў крэйцкопфнай плянцы, хаця паравоз прастойваў у дэпо па некалькі гадзін. У выніку, 12 сьнежня, сьледуючы з цягнікам 626, ён быў вымушан патрабаваць рэзэрву.

Узьняць працоўную дысцыпліну, павысіць адказнасьць і правільна арганізаваць работу ў дэпо — базавая задача дня.

На радзе вучасткаў Менскага дэпо ёсьць вусім дрэнныя паказальнікі. Ня выканана норма сярэдня-сутачнай работы паравозаў. Пры норме 8,8 гадзіны паравоз працаваў толькі 6,8. Некалькі недавыканая сярэднясутачны прабег пасажырскіх і таварных паравозаў. За 15 дзён было 58 зрываў спаранай. Праўда, у параўнаньні з лістападам ёсьць тут пэўны зрух, але ўсё-ж нельга ні ў якім разе яго прызнаць выстарчальным.

Аб сваіх перамогах рапартавалі сходу лепшыя паравозныя і рамонтныя вузла.

Тав. **Шакаліда**—машыніст СУ-9664—коратка паведамляе вынікі сваёй бліскучай работы за 15 дзён:

— Прабег перавыкаран на 77 проц. Эканомія апалу дасягнулі на 30 проц. Маем 44 мінуты нагону спазьненьняў. Ні аднаго зрыву спаранай і ні аднаго здарэньня ў дарозе за 15 дзён ня мелі.

І далей т. Шакаліда запэўнае схо «Наш паравоз носіць імя першага сакратара ЦК КП(б)Б т. Пікало. Кожны крок сваёй работы мы зьвязваем з гэтым ганаровым імем бальшавіка-ленінца. Мы паставілі перад сабой задачу—практычнай работай заваяваць пяршынства ў конкурсе. Будзем павышаць тэмпы работы.

Гаворыць машыніст т. **Цылыке:**

— Мы практычна ажыцьцяўляем загад наркома шляхоў зносін т. Андрэева аб павялічэньні карыснай работы паравоза. За 15 дзён конкурсу мы перавыканалі прабег на 67 проц. За гэты час мы маем 49 проц. эканомії апалу. Ня мелі ні аднаго зрыву спаранай і спазьненьня ў дарозе.

Тав. Цылыке паведамляе аб тым, як пры дапамозе шэфа 11-ай дыстанцыі шляху яны зрабілі паравоз культурным. На паравозе ёсьць бібліятэка, аптэчка, умывальнік, люстра, насьценная газэта. Ацеплена і афарбавана будка машыніста, зроблены мяккія сядзеньні для машыніста і яго памочніка.

Тав. **Касьцюковіч**, машыніст ОВ-4877, адзначаючы свае посьпехі, вымушан прызнаць і недахопы.

— Паравоз мае 48 проц. эканомії апалу, 37 мінут нагону спазьненьняў. Але ня выканана прабежная норма, мала зроблена ў напраўку ператварэньня паравозу ў культурны. Тав. Касьцюковіч абяцае выправіць недахопы першых 15 дзён конкурсу. Ён запэўнае, што да канца месяца ён прыйдзе са значна лепшымі паказальнікамі.

Рапартавалі яшчэ аб сваіх посьпехах за 15 дзён машыніст **Кугрышовіч**, ад 11-ай дыстанцыі шляху т. **Пауль**, ад абменнага пункту т. **Леановіч** і брыгадзір па рамонту таварных вагонаў т. **Баярэвіч**.

Першыя пазначныя посьпехі не даюць ніякага права ні арганізацыям вузла, ні ўсяму рабочаму калектыву супакойцца на ўзятых тэмпах. Работа павінна быць значна ўзмоцнена. Неабходна яшчэ вышэй узьняць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, дабіцца сапраўдных бальшавіцкіх паказальнікаў у рабоце. На гэтым завастрылі ўвагу на сходзе сакратар партколектыву цягі т. **Кузьнецоў** і інструктар партарганізатара раёну т. **Юдзіель**.

— Узмесьцярым тэмпы і якасьць работы, з большай упартасьцю будзем змагацца за ганаровае перадавое месца ў конкурсе!

Р. Д.

Арк. Зарубежны, М. Эстэры

Асінторф патрабуе неадкладнага аздараўленьня

(АД НАШАЙ СПЭЦЫЯЛЬНАЙ БРЫГАДЫ)

Асінторф — качагарка БелДРЭС Асінаўскія балоты — асноўная крыніца апалу, крыніца харчаваньня станцыі, матутная сіла, якой рухае канвэер сацыялістычнай прамысловасьці Беларусі.

Як-жа Асінторф спраўляецца з ускладзенымі на яго вялізарнымі задачамі.

За сэзон 1932 году торфінплян прадугледжваў торфзабычу ў 180.000 тон, з іх машына-фармовачнага 95.000 і фрэзэрнага — 85.000 тон. Фактычна здабыта машына-фармовачнага — 72.000 і фрэзэрнага—16.000. Ня выкананы і якасныя показальнікі. Паводле пляну сярэдні процант вільготнасьці павінен азначацца ў 30 проц. Фактычная яго вільготнасьць дасягае 50—60 і больш процантаў.

Такое становішча тлумачыцца радам прычын выключна ўнутрызаводзкага характару: дрэнная падрыхтоўка балот да іх эксплёатацыі, вялізарныя простоі машын (6.821 машына-гадзін), наяўмелая арганізацыя працы (абязьлічка, частая перакідка рабочых з месца на месца і г. д.). Дрэнная якасьць торфу ёсьць рэзультат несвячасовай яго сушкі.

Адгрузка торфу праходзіць таксама непадгушчальна марудна. Торфінплян прадугледжвае штодзённую адгрузку торфу БелДРЭС — 540 вагонтак (вагонтка — 1,5 тоны). Між тым, адгружаецца ня больш 230—240 вагонтак. Прычыны зрыву адгрузкі хаваюцца зноў такі ў няўмелай арганізацыі працы. Найбайнасьць, безгаспадарчасьць, поўны адсутнасьць прадусьцыпліны — вось асноўнае, што перашкаджае БелДРЭС своечасова атрымліваць торф. Пачнем з прапоўнай дысцыплины.

Выхад на работу — сыстэма па Асінторфе. 3-та сьнежня ня выйшла на работу ком пасьлятнік Балашоў і яго брыгада ў колькасьці 50 чал. У рэзультаце — недагрузка 150 тон торфу. 15 сьнежня ня выйшлі на работу 52 чалавекі з брыгады Шупілі на работу 52 чалавекі з брыгады Шупілі на работу 52 чалавекі з брыгады Шупілі. Па іх віне недавыведзены 82 вагонткі.

Сярэдняя ацэнка рабочай сілы — штодзённае зьяўленьне на работу — 80 проц. Ня ўсе рабочыя, якія ня выйшлі на работу, — ня ўсе, але ня ўсе, — ня ўсе, — ня ўсе, —

Блізкія Шлейхэру келы прадпанаюць новы роспуск рэйхстагу

БЭРЛІН, 23. «Таткрэйс» — бюлетэнь цесна зьвязаный з фон-Шлейхэрам групы, у артыкуле аб унутрыпалітычным становішчы Германіі ўказвае, што пасьля правалу спробы прымірыць Гітлера са Штрасэрам, у Штрасэра дзве магчымасьці: стварыць другое нацыянал-сацыялістыцкае аб'яднаньне, або з групаю сваіх прыхільнікаў уступіць у склад ураду. Бюлетэнь групы «Таткрэйс» перакананы, што Штрасэр не адыйдзе ад палітычнага жыцьця.

— Калі спроба фон-Шлейхэра прыцягнуць нацыянал-сацыялістаў у склад ураду яшчэ раз праваліцца, дык у ступені, — піша «Таткрэйс», — барацьба паміж фон-Шлейхэрам і нацыянал-сацыялістамі абвострыцца. У гэтым выпадку ўжо ў ступені магчымы роспуск рэйхстагу, а новыя выборы адбудуцца ў сакавіку.

Ня выключана, паводле слоў «Таткрэйс», што гэта выбарчая барацьба будзе мясіць выключна крывавым фонам. У гэтым выпадку ўрад будзе лабіяваць «спокойнай абстановы для правядзеньня выбараў усімі магчымымі сродкамі». Магчыма, што ён будзе прымушан у такім выпадку адкласьці выборы.

Гавораты аб перспэктывах новых выбараў, «Таткрэйс» указвае, што і гэтыя выборы ня ўнесьлі-б яснасьці ў становішча. Выборы далі-б зьмяшэньне галасоў нацыянал-сацыялістаў, прыкладна, на 20 проц. Наадварот, камуністы зноў умацніліся свае пазыцыі. Калі дадаць, што стомленасьць ад выбараў алаб'ецца асабліва на буржуазных выбарчыках, дык ня выключана, што правыя са сваімі галасамі апынуцца ў меншасьці, што прывяло-б партыі і рэйхстаг у яшчэ больш безнадзейнае становішча. (ТАСС).

Жабрачая падачка германскага ўраду беспрацоўным

БЭРЛІН, 22. Абмеркоўваецца рад важных гаспадарчых пытаньняў. Кабінет канцлера Шлейхэра зацьвердзіў асыгнаваньні на зімовую дапамогу беспрацоўным у суме 3 млн. марак. Дапамога будзе выдавацца на цэнтру 3 месяцы, пачынаючы са ступеня ў форме боп для атрыманьня па іх пратуктаў па больш ганнай цане. Па вылічэньнях газэт, на адзіцыяльныя паліцэйскія часьці. У сувязі з наяўнасьцю беспрацоўных на прадуктовыя крамы, якія ў апошнія дні ўсё больш пачынаюцца, берлінская паліцыя ўжыла рад мер. «Раён, які знаходзіцца пад пагрозай», ахоўваецца коннай і пешай паліцыяй. За данос на ўдзельнікаў нападу абвешчана ўзнагарода ў 300 марак. Ужо сёньня зроблен рад арыштаў рэвалюцыйных рабочых, якім прад'яўлена абвінавачаньне ў нападзе на прадуктовыя крамы.

Беспрацоўныя граміць прадуктовыя крамы ў Бэрліне

БЭРЛІН, 21. У Гоце паліцыяй распушчана дэлегацкая канфэрэнцыя камуністычнай арганізацыі. На канфэрэнцыі арыштаваны дэпутат ляндтагу Цюрынгіі Рэзэль.

У Нюрэмбэргу арыштавана 29 рэвалюцыйных рабочых, якім прад'яўлены абвінавачаньні ў прыналежнасьці да тэрарыстычнай арганізацыі. У Мюнхэне рэкваніравана галоўная дэманстрацыя калі муніцыпалітэту. Зроблен рад арыштаў. У Крэйцбургу (раён Бэрліну) супроць беспрацоўных былі выкліканы спэ-

КРЫЗІС У ПОЛЬШЧЫ АБВАСТРАЕЦЦА

Катастрафічны ўпадак подзінскай тэкстыльнай прамысловасьці

ВАРШАВА. З кожным месяцам пагаршаецца становішча прамысловасьці Польшчы. Асабліва ў цяжкім, проста катастрафічным, становішчы апынулася тэкстыльная прамысловасьць Польшчы. Так, у лістападзе г. г. вывезена з Лодзі толькі 314.381 кгр. тэкстыльных вырабаў на суму 1.739.218 зл. супроць 451.930 кгр. на 2.631.545 зл. у кастрычніку г. г. і супроць 687.173 кгр. на 6.100.662 злотых у лістападзе мінулага году. Такім чынам, экспарт тэкстыльных вырабаў лодзінскай прамысловасьці ў лістападзе бяг. году зьменшыўся ў параўнаньні з кастрычнікам на 40 проц., а ў параўнаньні з лістападам мінулага году — на 70 проц.

Ня ў лепшым становішчы знаходзіцца і іншыя галіны прамысловасьці ў Польшчы. У катастрафічным становішчы апынулася і польская цукровая прамысловасьць. Экспарт польскага цукру бязупынна зьмяншаецца, заўважае. Так, у мэй г. г. спажываньне цукру на ўнутраным рынку зьменшылася на 9 проц., у чэрвені — на 20 проц., у ліпені — на 18 проц., а ў верасьні — аж на 31,5 проц.

Унутранае спажываньне цукру складала ў лістападзе бягучага году 23.519 тон, супроць 28.268 тон у лістападзе мінулага году.

Што датычыць экспарту, дык у лістападзе бягучага году было вывезена за границу 38.457 тон супроць 98.954 тоны ў лістападзе мінулага году, усяго-ж за 3 месяцы бягучага году — верасень, кастрычнік і лістапад вывезена 49.208 тон. У параўнаньні з тым-жа перыядам часу мінулага году экспарт зьменшыўся звыш чым на 100 тыс. тон. І гэта ня глядзячы на застасаваньне ў высокай меры дампінгу!

Замежны гандаль скарачаецца

ВАРШАВА. Паводле афіцыяльных статыстычных даных, Польшча, разам з Данцыгам вывезла ў лістападзе г. г. 1.345.654 тоны тавараў на суму 98.605 тыс. зл., а прывезла 182.534 тоны на суму 76.713 тыс. зл. Дадатнае сальдо за лістапад выносіла такім чынам 21.982 тыс. злотых, або зьменшылася ў параўнаньні з кастрычнікам г. г. на 1.106 тыс. злотых.

Польскія эканамісты прадракаюць далейшае зьмяншэньне замежнага гандлю Польшчы. Праўдападобна, што каля 40 проц. фірм, якія зараз гандлююць з заграніцай, ня выкупяць патэнтаў на 1933 год.

Грашовы зварот унутры краіны слабее

ВАРШАВА. Грашовы зварот у кожнай капіталістычнай гаспадарцы зьяўляецца як бы пульсам гэтай гаспадаркі. Такі пульс гэтага звароту сьведчыць аб такіх эканамічнага жыцьця краіны. Як паказваюць афіцыяльныя лічбовыя даныя, грашовы зварот у Польшчы ў лістападзе зьменшыўся на 80,5 млн. зл. і ў ранцы гэтага месяца склаў 1.288,6 млн. зл. Зварот банкаўскіх білетаў (пазаровых грошай) зьнізіўся па працягу лістапада на 65,4 млн. зл. Зьмяншэньне паказвае таксама і зварот срэбнай манеты — на 11 млн. зл. і білёту — на 4,4 млн. зл.

Як бачым з гэтага, пульс капіталістычнай гаспадаркі Польшчы б'е ўсё слабей.

ПАМЯЦІ т. Д. І. КУРСКАГА

МАСКВА. Сьмерць Д. І. Курскага выклікала для партыі цяжкай стратай. Партыя страціла старога бальшавіка, стойкага рэвалюцыянэра і выдатнага савецкага работніка.

З самага пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі Д. І. Курскі выконваў адказнейшыя даручэньні савецкай улады як унутры краіны, так у апошні перыяд і за межамі СССР — на пасту савецкага дыпляната. Марксыцкая адукацыя і адданасьць справе рабочае класы далі Д. І. Курскаму магчымасьць з гонарам выконваць свае абавязкі на адказных органаў суда і разьвіцьця савецкага заканадаўства, дзе яго роля ў сацыялістычным будаўніцтве была асабліва вялікая і дзе ён зьяўляўся бліжэйшым і верным паточнікам Леніна.

Памяць аб Д. І. Курскім застанецца на доўгія гады ў рабочай клясе і ў шырокіх масах працоўных.

І. Сталін, В. Молатаў, В. Куйбышаў, М. Калінін, К. Варашылаў, Л. Кагановіч, С. Арджанікідзэ, Я. Рудзутак, А. Андрэеў, А. Мікаян.

АБМЕН РАТЫФІКАЦЫЙНЫМІ ГРАМАТАМІ ПАМІЖ СССР І ПОЛЬШЧАЮ

ВАРШАВА, 23. Сёньня ў будынку міністэрства замежных спраў у прысутнасьці кіруючых чыноўнікаў польскага міністэрства замежных спраў і адказных супрацоўнікаў савецкага паўпраўніцтва міністар замежных спраў Бэк і паўпраўнік СССР у Варшаве Антонаў-Аўсеенка абмяняліся граматамі ратыфікацыйнага пакту аб ненападзе, заключанага паміж Польшчай і СССР. У часе абмену граматамі міністрам Бэкам і паўпраўнікам Антонавым-Аўсеенкам былі сказаны прывітальныя прамовы.

ДА ПЫТАНЬНЯ АБ СУ БІН-ВЭНІ

ТОКІЕ, 23. У апублікаваным ваенным міністэрствам камюніке ўказваецца: «Перадаюць, што Су Бін-вэнь зараз знаходзіцца ў Томску і ў бліжэйшы час выедзе ў Эўропу. Паведамляюць, што каля 300 салдат са складу войск Су Бін-вэня, якія адзін час пранаваралі па заданьнях Чырвонай арміі ў раёне Чэты, накіраваны ў Хабараўск, за ўсякім выпадку ўстаноўлена, што разброеныя часьці Су Бін-вэня выведзены з раёну ст. Манчжурыя».

Агенцтва Сымбун-Рэнга паведамляе з Чанчуня, што Чжан Сюэ-лян тэлеграфна пра-паначаў Су Бін-вэню (які зараз знаходзіцца ў Маскве) пасторыць зварот у Бэйпін з тым, каб прыняць удзел у ваенных апэрацыях супроць японскіх войск, на границы правінцыі Жэхэ. Паводле слоў агенцтва, Су Бін-вэнь пераняў камандаваньне ў Кітай праз Эўропу. 3.000 салдат са складу войск Су Бін-вэня будуць адпраўлены ў Цянь-Цзінь праз Уладывасток.

У заключэньне агенцтва піша: «Чакаецца, што пасьля звароту Су Бін-вэня ў Кітай антыяпонская дзейнасьць Чжан Сюэ-ляна ўвая ўзмоцніцца.

АБВЯРЖЭНЬНЕ ТАСС

Камюніке японскага ваеннага міністэрства, апублікаванае ў Токіё 23 сьнежня, і паведамленьні агенцтва Сымбун-Рэнга пазбаўлены ўсякай падставы. Як ужо было апублікавана ў савецкай прэсе, генэрал Су Бін-вэнь з усімі сваімі афіцэрамі і салдатамі знаходзіцца ў якасьці інтэрнаванага ў раёне Томску. Ні сам генэрал Су Бін-вэнь, ні які-небудзь яго афіцэр ці салдат не выяжджалі і пакуль не выяжджаюць з Томскага раёну ні ў Маскву, ні ў які-небудзь іншы пункт СССР.

Далейшы іх лёс знаходзіцца ў залежнасьці ад абмену думак, які па гэтым пытаньні адбываецца паміж савецкім і кітайскім урадамі.

ВЫНІКІ КАНФЭРЭНЦЫІ МАЛОЙ АНТАНТЫ

ПАРЫЖ. 21. Не падлягае сумненьню, што галоўная задача апошняй белградзкай канфэрэнцыі Малой Антанты была выпрацоўка пастаноў на выпадак, калі краіны, што ўкшчуцца да перагляду Версальскага дагавору, пасягнуць зьмяніць цяперашнія межы эўрапейскіх дзяржаў.

Белградзкай канфэрэнцыі ў тутэйшых палітычных колах надаюць вялікае значэньне.

Гэта канфэрэнцыя павінна сэкрэтаваць будынак Малой Антанты, які расфасіраецца.

З другога боку, паводле вестак, атрыманых з сапраўдных крыніц, дэлегаты краін Малой Антанты ня ўтоеалі свайго незадаволеньня «слабасьцю» Эрыё на жэнэўскай канфэрэнцыі пяці дзяржаў у пытаньні аб рэўізіі «перамоганых» ва ўзбраеньнях.

Гэтыя пяць дзяржаў неяк-на арганізаваліся ў пастаянную установу, якая не абмяжоўвае сваю дзейнасьць падрыхтоўкай перагляду суадносін ваенных сіл у Эўропе, але разглядае гэты перагляд самастойна, без удзелу малых эўрапейскіх краін.

Канфэрэнцыя Малой Антанты паранылыа неадлоўна прадпрыняць адпаведныя крокі ў Парыжы і ў Лёндане, каб прымушаць французкі і англійскі ўрады выступіць у Берліне, галоўным-жа чынам у Рыме і Будапэшце, каб унесьці ў адносіны на падпяўнім-усходзе Эўропы неабходнае заспакаеньне.

Самай важнай пастановай белградзкай канфэрэнцыі зьяўляецца арганізацыя 3-ма дзяржавамі, увахоўлачымі ў склад Малой Антанты, можаецкага савету абароны, які складаецца з трох міністраў замежных спраў. Гэты савет павінен зьбірацца 3 разы ў год, прычым бесспэрэчнасьць каардынаванай работы забясьпечваецца пастаянным сакратарыятам, прабываючым у Жэнэве.

Адначасова ў Белградзе адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў чэха-словацкага, румынскага і югаславскага генштабаў. Гэта канфэрэнцыя паранылыа ўстанавіць пастаянае супрацоўніцтва камандаваньня трох армій, арганізацыю міжсакаюзнікіх галоўных штабаў і, на чэтках, агульнае камандаваньне.

Учора некалькі французкіх газэт прыводзілі словы, зьвернутыя венецыянскім сэнатарам Алоіза Маргэніто да венецыянскага сэнату: «Нікім-бы салодкім ня быў мір, ён можа жахаваць губительным для кожнай дзяржавы, калі любоў да спакою дасягне тэй ступені, якая перашкаджае бачыць далёкую небясьпеку і прадстаўляе непасрэдную небясьпеку далёкай».

Капітальным пры сучаснай дэвартызацыі паваротнае зараз небясьпеку вайны у значна большай ступені, чым у перыяд крызісу, які папярэджваў вайну 1914—18 г. г., калі ад адной іскры выбухнуў пажар на Балканах, які распаўсюдзіўся потым на ўвесь сьвет.

Фінансавыя затрудненьні нанкінскага ўраду

ШАНХАЙ 22. Апублікаваны даклад міністра фінансаў нанкінскага ўраду Сун Цзэ-вэня на пленуме цэнтральнага выканаўчага камітэту Гамінданду. У дакладзе ўказваецца, што мінулы год быў у фінансавых адносінах надзвычай цяжкім. Урад існаваў выключна за кошт пазык. Выпушчаныя ўрадам боны знаходзіліся ў пасе. Ураду ўдалося дагаварыцца з асацыяцыяй трымальнікаў бон і распрацаваць плян канверсіі. Спынена выдача фондаў урадавым органам. Правядзена жорсткае скарачэньне штатаў і паніжана заробная плата. Паступленьні за два апошнія бюджэтныя гады склалі 1.050 мільёнаў кітайскіх даляраў, а паступленьні ад пазык — 346 млн. Выдаткавана-ж было: на ваенныя расходы 614 млн., на грамадзянскае праўленьне — 116 млн., на аплату пазык — 479 млн. і на плацяжы па ваенных кантрыбуцыях — 79 млн.

У дакладзе падкрэсьліваецца, што ўрад яшчэ не ліквідаваў фінансавага крызісу. Далейшае-ж скарачэньне выдаткаў немагчыма

Прыгавор над украінцамі ва Львове

ДАНІЛІШЫН І БІЛАС ПАВЕШАНЫ

ВАРШАВА, 22. Польскае агенцтва паведамляе: «У сувязі з прыгаворам, вынесеным сёньня ва Львове, прэзыдэнт рэспублікі адхіліў хадайніцтва аб памілаваньні ў адносінах Данілішына і Біласа. Прыгавор Жураковскаму заменен турэмным зьняволеньнем тэрмінам на 15 год.

**

ВАРШАВА, 23. Польскае агенцтва паведамляе: «Ва Львове сьмяротны прыгавор у адносінах Данілішына і Біласа прыведзен у выкананьне».

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

10 год навуковай і лекава-прафілактычнай работы

29 сьнежня спаўняецца 10 год са дня арганізацыі ў Менску другой хірургічнай і першай тэрапэўтычнай клінік Беларускага медычнага інстытуту.

За гэты час клінікі пры актыўнай дапамозе мясцовых арганізацый прарабілі вялікую навуковую работу, разгарнулі лекава-прафілактычную дзейнасьць і сталі цэнтрам падрыхтоўкі дактароў і навуковых работнікаў па хірургіі і тэрапіі.

40 тыс. хворых, прапушчаных праз стацыянар, 70 тыс. амбуляторных наведваньняў, 7 тыс. апэрацый, 76 навуковых работ на беларускай, расійскай, нямецкай і французкай мовах — вось балянс работы другой хірургічнай клінікі за 10 год.

Сярод выпушчаных навуковых прац асаблівую ўвагу заслугоўваюць наступныя: «Хірургічнае лячэньне вадзянкі галавы» праф. Сакалоўскага, «Лячэньне слановасьці» праф. Сакалоўскага, «Обезображивающий артрит» дацэнта Мангейма, «О перевязке семеновыносящих протоков» кап. Іргера, «Об одностажном шве при желудочных операциях» дацэнта М. Н. Шапіра і інш.

Кіруе клінікай прафэсар Сакалоўскі.

Ня меншых посьпехаў дабілася і другая тэрапэўтычная клініка, на чале якой стаіць прафэсар Мелкіх — вучань выдатнага расійскага тэрапэўта праф. Астраумава.

Прафэсар Мелкіх перанёс школу Астраумава ў клініку, дабіўшыся ўзьнясьцця яе на больш вышэйшую ступень.

Клініка дала 3-х савецкіх прафэсароў, 5 дацэнтаў, 11 асыстэнтаў і г. д.

Пры гэтай-жа клініцы ёсьць сухотнае аддзяленьне. Арганізована інстытут пераліваньня крыві.

Выпушчана каля 35-40 навуковых работ. Сярод іх: «Введение в терапию сердечных больных инфраинфекций» праф. Мелкіха і дацэнта Сітэрмана, «Руководство по гематологии» (2 выд.) праф. Гінзбурга і інш.

10-годзьдзе работы клінік на адным з адказных вучасткаў савецкай аховы здароўя будзе адзначана ўрачыстым вечарам з удзелам навуковай грамадзкасьці Менску. На вечары прафэсары Сакалоўскі і Мелкіх выступяць з дакладамі аб дзейнасьці клінік.



ЗЬВЕРХУ: Праф. МЕЛКІХ С. М.—дырэктар 1-ай тэрапэўтычнай клінікі. ЗЬНІЗУ—праф. САКАЛОЎСКІ М. П.—дырэктар 2-ой хірургічнай клінікі.

Напярэдадні ўсебеларускага дня ўдарніка

Зьлёты герояў пяцігодкі

На многіх прадпрыемствах Менску разгарнулася падрыхтоўка да ўсебеларускага дня ўдарніка — 1-га студзеня.

На чырвонасьцяжнай гарбарні «Бальшавік» праводзяцца гутаркі з новапрышоўшымі рабочымі аб пастанове ЦВК і СНК аб барацьбе з прапушчынкамі. У вынніку—у хромавым цэху прапулы ліквідаваны.

Абвешчан конкурс на лепшую брыгаду. Шырока разгарнулася сацыяборніцтва на выкананьне прамфінплану 1933 г.

Ідзе падрыхтоўка да заводзкага зьлёту герояў першай пяцігодкі. Асьцягваны сродкі для прамівываньня.

На заводзе імя Варашылава плян за пістапад быў выкананы на 100 проц., сьнежань абвешчан штурмовым месяцам. 31 сьнежня на заводзкім зьлёце ўдарнікаў будзе прамівываньне лепшых ударнікаў. Упераддзе па падрыхтоўцы ідзе кацельны цэх.

Менгарпрафсавет праводзіць рэйд па Менскіх цательнях з мэтай палепшэньня матар'яльна-бытавога абслугоўваньня рабочых.

На фабрыцы імя Фрунзэ (быш. «Беларуская») у сувязі з падрыхтоўкай да дня ўдарніка гадавы прамфінплан на 20 сьнежня выкананы на 100,3 проц.

Усебеларуская нарада работнікаў мукамольнай прамысловасьці

У Менску скончылася ўсебеларуская нарада дырэктароў і старшынь заўкомаў мукамольных прадпрыемстваў.

Нарада ў асноўным была прысьвечана вынікам работы мукамольнай прамысловасьці ў 1932 г. і перспэктывам на 1933 г.

Толькі паасобныя прадпрыемствы і, у прыватнасьці, Менскі млын «Адраджэньне» і Аршанскі млын перавыканалі праміфінплян, астатнія-ж прадпрыемствы працавалі незадавальняюча.

Нарада ўключылася ў штурм спрат і вызначыла рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўзмацненьні тэмпаў работы млынноў, барацьбе з прастоямі і г. д.

Творчыя вечары беларускіх пісьменьнікаў

З мэтай азнаямленьня шырокіх мас з творчасьцю беларускіх пісьменьнікаў і беларускай літаратурнай арыгінальнасьці Саюзу савецкіх пісьменьнікаў БССР арганізуе рад дакладаў і творчых вечароў.

З 30 студзеня па 10 сакавіка адбудуцца творчыя вечары наступных пісьменьнікаў: М. Лужаніна, К. Чорнага, Н. Зарэцкага, Р. Кобеца, С. Баранавых, З. Бядулі, П. Глебкі. Дакладчыкамі на гэтых вечарох выкліканы т. т. Глебка, праф. Піатуховіч, П. Галавач, Вольскі, Барысёнак і інш.

Дыспут аб „Бацькаўшчыне" ў БДТ-1

Акадэмія навук арганізуе 25 сьнежня ў доме Камасьмолу вялікі дыспут аб «Бацькаўшчыне» у БДТ-1. З дакладамі выступяць рэжысэр гэтага спэктаклю Літвінаў і прафэсар Піатуховіч.

СУД

Бандытаў—да расстрэлу

22 сьнежня Вярхоўны суд БССР на адкрытым пасяджэньні разглядаў справу шайкі бандытаў з 6 чал., якая ва працягу 1932 году займалася бандыцкімі нападамі на грамадзян Менску, галоўным чынам, на акраінах гораду.

Ноччу на 13 кастрычніка ў садзе «Прафінтэрн» бандыты задушылі і разьдзелі калгасьніка Івана Карухіна. 14 кастрычніка ўвечары імі быў пазбаўлены нажом гр-н Ясюк. Апошняга разьдзелі і адабралі ў яго рэчы з дакумантамі. Імі-ж зроблен яшчэ рад злачынстваў.

Вярхоўны суд БССР прыгаварыў.

Маспэйцкага, Кенцёра, Бяспалава і Коўзіна да вышэйшай меры сацыяльнай абароны — расстрэлу.

Астатнія ўдзельнікі бонды Міхневіч і Дрыц прыгавораны да 10 год пазбаўленьня волі. Прымаючы пад увагу маладосьць Дрыца кара зьменшана з 10 год да 6 год і 8 месяцаў.

Хроніка

* Другі тур прафдня па масавым аборы учыцца праводзіцца з 25 сьнежня па 1-га студзеня. Усім фэкультурным, камсамольскім, прафэсыянальным і загатоўчым арганізацыям прапанавана ўключыцца ў правядзеньне прафдня, забясьпечыўшы выкананьне гадавога пляну па абору ўчыцца да дня ўдарніка.

* Антыалкагольная выстаўка адкрываецца 24 сьнежня ў будынку Беларускага Дзяржаўнага сацыяльна-гістарычнага музэю ў Менску. Арганізаваныя экскурсіі наведваюць выстаўку бесплатна.

* БДТ-3 упяршыню паказвае рабочаму гледачу Гомелю п'есу Н. Пагодзіна «Мой друг». П'есу стаўлі кіраўнік тэатру тав. Санікаў.

ПАПРАУКА

У артыкуле «Горэвскі с.-с. самы адстаючы ў Рэчыцкім раёне», («Зьвязда», 21 пістапада) указана, што на чале вышэйшай радацыі «Рэчыцкая праўда» стаіць тав. Кузьнецоў, павінна быць Н. КВЯТКОЙ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

24 сьнежня, у 7 гадз. вечара, у клюбе імя VII зьезду прафсаюзаў (б. Сакгандэльслужачых—рог Камуністычнай і Энгельса)

скліканецца

агульна-гарадзкая канфэрэнцыя

ўкладчыкаў ашчадкас, пазыкатрымальнікаў і фінактыву.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Роля дзяржпазыту і ашчадсправы ў сацыялістычным будаўніцтве і задачы грамадзянскіх у набліжэньні сродкаў насельніцтва. 2) Перадача пераходнага Чырвонага Сьцягу імя Менгаркому КП(б)Б Менгарсавету і Менгарпрафсавету і рапарты калектываў во выкананьні фінплану. 3) Выбары камэрт.

Партколе тывак. ячэйкам КП(б)Б. ФЗМК забясьпечыць своячасовую яўку дэлегатаў на канфэрэнцыю па модусе ад 50 укла дчыкаў і пазыкатрымальнікаў—1 дэлегат.

Менгарком КП(б)Б
Менгарпрафсавет
Менгарсавет.

25 сьнежня, у 7 гадзін веч., у доме Пісьменьніка

АДБУДЗЕЦЦА

адкрытае пасяджэньне

праўленьня Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі

ПАРАДАК ДНЯ: АБГАВАРЭНЬНЕ ПРАЕКТАЎ ТЭМАТЫЧНЫХ ПЛЯНАЎ ДЕВ НА 1933 год.

Запрашаюцца: пісьменьнікі, навуковыя работнікі, спэцыялісты, ІТР, кнігагандлёвыя работнікі і ўсе жадаючыя.

Праўленьне.

З КАНЦА БЯГУЧАГА 1932 году

Інстытут эканомікі Беларускай Акадэміі Навук

ПРЫСТУПАЕ ДА ВЫДАНЬНЯ БІБЛІЯТЭКІ ПАД НАЗВАЮ

„ЭКАНАМІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА"

пад рэдакцыяй прафэсар Т. Ф. ДОМБАЛЯ.

„ЭКАНАМІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА" будзе складацца з пяці наступных серый:

I-я серыя — Маркс, Энгельс, Ленін, Сталін;
II-я серыя — „Эканамічная школа".
III-я серыя — працы Інстытуту эканомікі;
IV-я серыя — навукова-папулярная
V-я серыя — Эканамічна-тэхніч. бібліятэка

Выданьне разьлічана на 3 гады і будзе заключаць у сабе каля 100 аркушаў у сотні дасьвеў ары ушовых выпускаў. Па выхадзе працы „Эканамічнай бібліятэкі" паступаюць у продаж за ўсе магазыны Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі і БАКТ.

На ўсе серыі адкрыта абанімэнтная падпіска. Зварачацца па адрасе: Менск, Беларуская Акадэмія Навук.

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1933 год

на палітыка-эканамічны

ДВУХТЫДНЁВІК—орган ЦК КП(б)Б

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

зьяўляецца бачным палітычным органам ЦК КП(б)Б, які разгортвае на аснове Марксізму—Ленінізму злабадзённыя тэарэтычныя праблемы, зьвязаныя з сацыялістычным будаўніцтвам СССР і БССР і дапамагае арганізацыі і мабілізацыі мас на барацьбу за пабудову сацыялізму.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

асьвятляе асноўныя пытаньні міжнароднай рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту і асьцяліва пытаньні, зьвязаныя з асноўнымі палітыка-эканамічнымі працэсамі ў Польшчы і Заходняй Беларусі, ставіць шчамі чарговымі задачамі КПП і КПЗБ.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

вядзе распрацоўку пытаньняў ленінскай нацыянальнай палітыкі змагаецца за не ажыцьцяўленьне на аснове рашучай барацьбы з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекай на даным этапе, контрэвалюцыйным нацыянэкратызмам нацыяпартызанам і мясцовым шавінізмам усіх колераў.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

спадзяйнічае павышэньню тэарэтычнага і палітычнага ўзроўню шырокіх мас партыйнага актыву, вядзе распрацоўку асноўных прынцыповых пытаньняў гісторыі КП(б)Б.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

вядзе крытыку і бібліяграфію літаратуры па асноўных партыйна-тэарэтычных праблемах.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

цьвёрда змагаецца за генэральную лінію партыі супроць усякіх ухілаў і прымірэнцтва да іх.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА на 1933 год.

на 1 месяц — 50 к. на 6 мес. — 3 р.
на 3 месяцы — 1 р. 50 к. на 12 мес. — 6 р.

Падпіска прымаецца на пошце, лістаносцамі і ўпаўнаважанымі па партарыку пры партячэйках.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 12 г. дня — Чэшскі мастацкі фільм СУСТРЭЧНЫ

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 12 г. дня — Замежны мастацкі фільм Пасынкі Бэрліну. Зьвыш праграмы кіно-хроніка

Пралетары — Мастацкі фільм Лятаючае шчасьце. Дзенныя дзіцячыя сэансы ТВАРАМ да ТВАРУ

СПАРТАК Каса—ад 1г. дня — Выдатны фільм Трыпольская трагедыя трагедыя ў 7 частках

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону 7-81

У ВЫДАНАЙ ДЗЯРЖАЎНЫМ ВЫДАВЕЦТВАМ БЕЛАРУСІ

брашуры „Рэзалюцыі IV пленуму ЦКК КП(б)Б 24-27 лістапада 1932 г."

УКРАЛІСЯ НАСТУПНЫЯ ПАМЫЛКІ ДРУКУ:

1) на старонцы 32, радок 2 зьверху, надрукавана: „Праверка в бюру ЦК і ЦКК"—трэба чытаць „Праверка в бюру ПК ЦКК";
2) на старонцы 37, радок 6 зьверху, надрукавана: „Па РК прыцягнута"—трэба чытаць: „Па РКК прыцягнута";
3) на стар 39, радок 3 зьнізу, надрукавана: „Рашэньне II пленуму"—трэба чытаць: „Рашэньне III пленуму";
4) на стар. 40, радок 6-7 зьверху, надрукавана: „найменшыя"—трэба чытаць: „малейшыя".

Заг. партмасавага сэктару ДЕВ АЛЬТЭРАН.

Менскі радыёвузел

даводзіць да ведама ўсіх грамадзян і арганізацый гор. Менску і яго раёну, якія маюць

лямпавыя радыё-ўстаноўкі

і жадаюць іх абслугоўваць, што яны павінны аб гэтым да 1-га студзеня 1933 году падаць заяўкі ў Менскі радыёвузел, бо без заявак пасьля ўказанага тэрміну ні адна радыёўстаноўка абслугоўвацца ня будзе.

Кошт за абслугоўваньне па гораду—15 р. у месяц і раёне—20 руб.

Менскі радыёвузел.

ІНСТЫТУТ ГЕАЛЁГІІ

Беларускай Акадэміі Навук

даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых прадпрыемстваў і установаў, што заяўкі на геалёгічныя і гідрагеалёгічныя дасьледы ў 1933 годзе прымаюцца ім да 1-га лютага 1933 г., да якога тэрміну яны павінны быць аформлены дагаворамі.

Заяўкі накіроўваць па адрасе: Менск, Ленінскае вул. д. № 79-35.

Дырэкцыя.

Калектыў кнігі УсеЛКСМ Усесаюзнага Навукова-Дасьледчага Балотнага Інстытуту выказвае сваё спачуваньне т. БЕЛЬСКАМУ ЎЛАДЗІМЕРУ з прычыны раптоўнай

сьмерці яго маці.

Менск, друкарня «Зьвязды».

Галоўлітбел № 337.